Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

30 МАЯ 2019 г. ЧАЦВЕР № 99 (28966)



БУДНІ МІНСКАГА ПАШТАЛЬЁНА

5



ДАСКОЧЫЦЬ ДА СВАЙГО ШЧАСЦЯ

13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Валянцін РУСОВІЧ, каардынатар праграм СААЗ па грамадскай ахове здароўя Краінавага бюро СААЗ у Беларусі:**

*«Сусветная арганізацыя аховы здароўя вітае прыняцце дэкрэта Прэзідэнта Беларусі № 2 ад 24 студзеня 2019 года, згодна з якім у краіне робіцца больш жорсткім антытытунёвае заканадаўства. Гэтым дакументам, у прыватнасці, пашыраны пералік месцаў, у якіх цалкам забараняецца курэнне. З 27 ліпеня Беларусь, як і суседнія краіны, нарэшце забароніць курэнне ўнутры кавярняў, бараў, цягнікоў далёкіх напрамкаў, унутры пакояў у гасцініцах. Гэта прынясе каласальны станоўчы эфект. Як чакаецца, такая мера дазволіць на 15 % знізіць распаўсюджанасць курэння, у тым ліку пасіўнага. За 40 гадоў удасца скараціць колькасць смерцяў на 116 тысяч».*

## КОРАТКА

- **З 2020 года памер грашовага забеспячэння ваеннаабавязаных на зборах складзе ад Br156 да Br331,5 штомесяц у залежнасці ад воінскага звання. У цяперашні час сума вар'іруецца ад Br8,39 да Br14,63.**
- Аўдытары Еўракамісіі станоўча ацанілі працу па кантролі якасці прадукцыі жывёлагадоўлі ў Беларусі.
- **«J: Морс» адзначыць 20-годдзе турам па Беларусі. Старт будзе дадзены 18 кастрычніка ў Брэсце. Затым адбудуцца выступленні ў Магілёве, Мінску, Віцебску, Гомелі, Гродне.**




# НАПЕРАДЗЕ — НОВЫ ЭТАП ІНТЭГРАЦЫІ



Фота БелТА.

**Аляксандр Лукашэнка ўзяў удзел у саміце кіраўнікоў дзяржаў Еўразійскага эканамічнага саюза ў Нур-Султане.**

Нагадаем, цяперашняе пасяджэнне ў Казахстане носіць юбілейны характар. Мерапрыемства прымеркавана да дзвюх дат: 5-годдзя падпісання Дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе і 25-годдзя ідэі еўразійскай інтэграцыі. Па выніках была прынята сумесная заява з нагоды пяцігоддзя падпісання дагавора аб саюзе, а таксама падпісаны міжнародны дагавор аб фарміраванні агульнага рынку электраэнергіі ЕАЭС. Удзельнікі саміту падпісалі больш за 20 дакументаў.

Прыводзім галоўныя тэзісы выступлення беларускага лідара на гэтым мерапрыемстве.

## Прыярытэт — якаснае выкананне дамоўленасцяў

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў: важна якасна выконваць ужо наяўныя ў саюзе дамоўленасці. Актыўнасць на знешнім контуры і па новых кірунках не павінна шкодзіць асноўнай дзейнасці па адмене бар'ераў, выключэнняў і абмежаванняў ва ўзаемным гандлі, упэўнены ён.

Паводле слоў Прэзідэнта Беларусі, станоўчы эфект ад інтэграцыйнага праекта дадуць больш цесная каапераццыя, павелічэнне долі на агульным рынку тавараў, выраблены ўнутры ЕАЭС. Ён заклікаў адмовіцца ад пратэкцыяніцкіх рашэнняў на нацыянальных узроўнях, увядзення разнастайных забаронных і абмежавальных мер.

СТАР. 2

# ПЕРШЫ АПОШНІ ЗВАНОК



Мінскую школу № 204 адчынілі летась 1 верасня. У адной з самых маладых у краіне навучальных устаноў паспяхова прайшоў першы навучальны год. Надышоў гістарычны момант: апошні званок для выпускнікоў, а для самой установы — першае свята апошняга званка. Выпускнікамі сталі сорак сем хлопцаў і дзяўчат двух дзявятых класаў (у адзінаццаты клас вучняў не набіралі). Для іх, а таксама для першакласнікаў (у школе аж шэсць першых класаў) па шматгадовай традыцыі прайшла ўрачыстая лінейка і праззвінеў сімвалічны званок. Адказную і ганаровую місію даверылі старанным і актыўным вучням — Яўгену ЗАЙЦАВУ і Анфісе АКУДОВІЧ (*на фота*).

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

**Увесь фотарэпартаж глядзіце на сайце zviazda.by**

Экспертыза

# ДНК РАСКРЫВАЕ САКРЭТЫ



**«Гэты рэактыў дзейнічае аднолькава добра незалежна ад таго, свежая кроў ці не. Калі б ён быў адкрыты раней, то сотні людзей, што цяпер разгульваюць на свабодзе, даўно б ужо расплаціліся за свае злачынствы». Гэтыя словы належаць бессмяротнаму герою Артура Конан Дойля Шэрлаку Холмсу, які, па сюжэце твора «Эцюд у барвовых тонах», вынайшаў рэактыў, што дазваляў высвятліць, утварылася пляма ад крыві ці ад нейкага напою. З канца XIX стагоддзя, калі пісаліся гэтыя радкі, мінула шмат гадоў.**

У кастрычніку 1953 года было абвешчана, што адкрыта малекулярная структура ДНК. Гэта адкрыццё зрабіла рэвалюцыю не толькі ў біялогіі, але і ў сумежных з ёй сферах. Адной з іх стала і судова-біялагічная экспертыза.

— Зараз генетычная экспертыза выкарыстоўваецца падчас расследавання практычна ўсіх відаў злачынстваў, пры здзяйсненні якіх чалавек мог пакінуць свае біялагічныя сляды, — адзначыла **намеснік начальніка ўпраўлення судова-біялагічных экспертыз, начальнік аддзела генетычных экспертыз ДКСЭ Вікторыя КОРБАН.** — Біяматэрыялам можа стаць што заўгодна — кроў, сліна, валасы, часцінкі скуры, адбіткі пальцаў... А яшчэ яна дапамагае расставіць кропкі над «і» датычна падзей, якія адбываліся не адно дзесяцігоддзе таму. Цяжка ўявіць сабе, што судовай генетыцы ўсяго толькі чвэрць стагоддзя. Мне ўдалося знайсці ў архіве адну з самых ранніх экспертыз, за студзень 1994 года, у якой я прымала ўдзел. Тая экспертыза датычылася высвятлення радства. І калі да 1996 года такія даследаванні былі адзінкавыя, то цяпер іх праводзіцца штогод каля 15 тысяч.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

# НАПЕРАДЗЕ — НОВЫ ЭТАП ІНТЭГРАЦЫІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«У гэтым залог фарміравання надзейнага падмурка нашага саюза, паспяховага развіцця эканомік краін, якія ўдзельнічаюць у інтэграцыі. Тады не будзе праблемы прыцягнення новых краін, якія мы хочам бачыць у саюзе. Яны самі прыйдуць у гэты саюз», — упэўнены кіраўнік беларускай дзяржавы.

Ён таксама падкрэсліў, што трэба ствараць роўныя ўмовы ва ўсіх сферах, у тым ліку энергетыцы, але пакуль перавага аддаецца інтарэсам асобнага суб'екта гаспадарання, галіны або краіны.

## Малады і эфектыўны

Прэзідэнт адзначыў, што ЕАЭС яшчэ досыць малады, аднак ужо даказаў сваю эфектыўнасць і самастойнасць, бо забяспечыў нашы краіны дадатковай крыніцай эканамічнага росту, што дазваляе супрацьдзейнічаць негатыўным тэндэнцыям у свеце. «І гэты патэнцыял не проста далёка не вычарпаны, яму наогул не пакладзены пачатак. Наперадзе велізарныя перспектывы», — сказаў ён.

У апошнія гады ўдаецца падтрымліваць павелічэнне аб'ёмаў узаемнага гандлю, аднак беларускага лідара насцярожвае, што тэмпы нарошчвання тавараабароту ў рамках саюза запавольваюцца.

Акрамя таго, у ЕАЭС таксама пашыраецца выкарыстанне нацыянальных валют ва ўзаемных разліках, удалося пагасіць інфляцыйныя рызыкі, узяць пад кантроль пытанні занятасці насельніцтва. Па словах кіраўніка беларускай дзяржавы, гэта азначае, што краіны — удзельніцы саюза ўсё больш сінхранізуюць працэсы свайго развіцця, паступова збліжаючы пазіцыі ў правядзенні ўзгодненай макраэканамічнай палітыкі. І такі досвед трэба выкарыстоўваць для фарміравання агульных галіновых стратэгій.

Прэзідэнт Беларусі звярнуў увагу, што з ЕАЭС лічацца на сусветнай арэне, працягваецца дыялог з іншымі краінамі.

«Парадак дня напаўняецца новымі кірункамі для працы. Мы прыступілі да лічбавай трансфармацыі эканомік, актывізацыі трансгранічных сувязяў у рэальным сектары, стварэння механізмаў рэалізацыі інавацыйных і інвестыцыйных праектаў. Гэта ўсё — важныя і перспектыўныя сегменты супрацоўніцтва», — дадаў ён.

## Не страціць і развіваць

«Пяць гадоў таму мы зрабілі рашучы крок да стварэння саюза. Галоўная задача бягучага дня — захаваць дасягнутыя вынікі і прымножыць іх на карысць нашых дзяржаў і народаў. У сённяшній заяве мы фармулюем асноўныя прынцыпы і прыярытэты далейшага супрацоўніцтва», — сказаў беларускі лідар.

Кіраўнік беларускай дзяржавы перакананы: сумеснымі намаганнямі бакам удасца дамагчыся ўмацавання еўразійскай інтэграцыі.

Таксама Аляксандр Лукашэнка прапанаваў першаму Прэзідэнту Казахстана на пасадзе Ганаровага старшыні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета заняцца рэвізіяй усяго таго, што зроблена ў саюзе, пачынаючы кадравым складам камісіі і заканчваючы стратэгічнымі кірункамі дзейнасці.

На думку беларускага лідара, важна далейшае пашырэнне паўнамоцтваў Еўразійскай эканамічнай камісіі, у першую чаргу ў частцы працэдзеяння ўвядзенню бар'ераў, — і тут значную дапамогу можа аказаць Ганаровы старшыня Вышэйшага эканамічнага савета.

***

Таксама ў межах саміту Прэзідэнт Беларусі абмеркаваў са сваім расійскім калегам Уладзімірам Пуціным пытанні паглыблення двухбаковай інтэграцыі.

Раней бакі абмяняліся прапановамі па тэме, а ўчора кіраўнікі дзяржаў разгледзелі гэтыя пытанні ў першым набліжэнні і далі даручэнне ўрадам — да 21 чэрвеня знайсці па кожным з іх агульныя падыходы.

Пасля лідары дамовіліся правесці сустрэчу на вышэйшым узроўні для падрабязнага абмеркавання ўсіх двухбаковых пытанняў і далейшага сістэмнага ўзаемадзеяння.

**Паводле БелТА.**

Супрацоўніцтва

# КАПІТАЛ СЯБРОЎСТВА І ЎЗАЕМАПАВАГІ

### Беларуска-італьянскі тавараабарот да 2020 года плануецца павялічыць да мільярда еўра

**Летась краіны нагандлявалі на 800 мільёнаў еўра, і тавараабарот працягвае павялічвацца. Пра гэта паведаміў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Італіі ў Беларусі Марыа БАЛЬДЗІ падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры, прысвечанай Дню абвяшчэння рэспублікі.**

Як адзначыў пасол, Італія знакамітая трыма f: food, fashion, furniture (ежа, мода, мэбля). Менавіта яны і з'яўляюцца традыцыйнай асновай тавараабароту. Да актуальных кірункаў апошняга часу належыць і супрацоўніцтва ў галіне аднаўляльнай энергетыкі, зялёнай эканомікі, а таксама вытворчасці станкоў і ўпаковачных машын.

Але «сэрцам» партнёрства паміж Беларуссю і Італіяй дыпламат назваў гуманітарныя адносіны. Напрыклад, пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС каля паўмільёна беларускіх дзяцей атрымалі аздараўленне ў паўднёва-еўрапейскай краіне. Толькі летась 130 беларускіх дзяцей-сірот знайшлі новую сям'ю ў Італіі.

Марыа Бальдзі падкрэсліў, што палітычныя адносіны нашых краін зараз у стадыі «перазапуску», і выказаў надзею, што візавы рэжым паміж Беларуссю і Еўрапейскім саюзам будзе спрошчаны ў найбліжэйшы час. Пасол адзначыў, што для італьянскіх вытворцаў беларускі рынак — прывабныя вароты ў ЕАЭС, а таксама вялікі лагістычны хаб.

Марыа Бальдзі ўпэўнены, што Беларусь можа стаць цэнтрам турыстычнага прыцягнення — нездарма ўсё больш ягоных суайчыннікаў наведваюць Сінявокую (асабліва дзякуючы бязвізаваму рэжыму). «У краіны ёсць усё, чаго шукаюць сучасныя вандроўнікі: чыстае наваколле, экалагічная ежа, распрацаваная інфраструктура, ветлівы народ. Беларусь — гэта сапраўды Белла Русь, bellissima!», — падзяліўся ўражаннямі пасол.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Выбары-2019

# У ЧАКАННІ КАМПАНІІ

**Учора ЦВК вызначыла сярэднюю колькасць выбаршчыкаў на акругу па выбарах дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі сёмага склікання. Гэты паказчык склаў 62 934 чалавекі.**

Аб гэтым заявіла журналістам старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына перад пасяджэннем Цэнтральнай камісіі Беларусі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў. Само пасяджэнне было падрыхтоўчым.

На ім зацвердзілі метадычны дапаможнік і парадак правядзення трэнінгу для ўчастковых выбарчых камісій і практычны дапаможнік для тэрытарыяльных і акруговых камісій. У прыватнасці, кожную ўчастковую камісію абавязалі абсталяваць сядзячыя месцы на ўчастках для галасавання выбаршчыкаў з інваліднасцю, пажылых людзей.

Што датычыцца канкрэтнай даты правядзення парламенцкіх выбараў, то яе вызначае Прэзідэнт. Цэнтральная камісія пакуль называе толькі месяц — гэта лістапад. Калі выбары будуць прызначаныя на пачатак лістапада, то выбарчая кампанія можа стартаваць у канцы ліпеня, а калі ў сярэдзіне лістапада, то старт будзе дадзены ў першай дэкадзе жніўня.

Таксама Лідзія Ярмошына расказала журналістам, што зусім хутка прадстаўнікі нашай Цэнтральнай выбарчай камісіі (яна сама і член камісіі Ірына Целікавец) адпраўяцца ў Казахстан, каб назіраць за пазачарговымі выбарамі прэзідэнта гэтай краіны. Нагадаем, абранне кіраўніка дзяржавы ў Казахстане пройдзе 9 чэрвеня.

За дзень да выбараў прадстаўнікі ЦВК наведаюць выбарчыя ўчасткі і ацэняць іх гатоўнасць. Акрамя таго, запланавана сустрэча з кіраўніцтвам Цэнтрвыбаркама Казахстана.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

Факт

# НЕ ДАРОСЛЫ — НЕ ГУЛЯЙ

**Падаткавікі яшчэ раз нагадваюць нам, што гуляць на грошы ў нашай краіне дазваляецца толькі ў дарослым узросце.**

Міністэрства па падатках і зборах (МПЗ) Беларусі інфармуе, што ўзроставы цэнз для наведвання ігральных устаноў, у тым ліку віртуальных, і ўдзелу ў азартных гульнях павялічаны з 18 гадоў да 21 года з 1 красавіка гэтага года.

Адначасова прэс-служба МПЗ звяртае ўвагу на тое, што Палатай прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу ў першым чытанні прыняты Закон Рэспублікі Беларусь «Аб змене кодэксаў». А гэты дакумент прадугледжвае замацаванне ў артыкуле 12.11 Кодэкса РБ аб адміністрацыйных правапарушэннях (КаАП) адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне арганізатарам азартных гульняў забароны на допуск у іграорную ўстанову (у тым ліку віртуальную) асоб, якія не маюць на гэта права.

А і праўда, маладым не месца за сталом з рулеткаю.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Эгілса Левітса абралі прэзідэнтам Латвіі



Сейм Латвіі на пазачарговым пасяджэнні абраў прэзідэнтам краіны юрыста Эгілса Левітса, паведаміла PIA Навіны. У гэтай краіне прэзідэнта выбірае парламент. На пасаду прэтэндавалі тры кандыдаты — Левітс, амбудсмен Юрыс Янсонс і дэпутат Дідзіс Шмітс. Большасць дэпутатаў Сейма падтрымалі кандыдатуру Левітса. Дзеючы прэзідэнт Латвіі Раймонд Веёніс вырашыў не балатавацца на другі тэрмін. Левітс у 1982 годзе скончыў юрыдычны факультэт Гамбургскага ўніверсітэта, у 1985-м — факультэт грамадскіх навук і філасофіі гэтай жа ВНУ. Быў паслом Латвіі ў Германіі, Швейцарыі, Аўстрыі і Венгрыі, дэпутатам Сейма пятага склікання, міністрам юстыцыі, членам Еўрапейскага суда па правах чалавека ад Латвіі. Балаціраваўся на пасаду прэзідэнта ў 2015 годзе. Таксама з'яўляецца аўтарам прэамбулы канстытуцыі Латвіі.

## Датэрміновыя парламенцкія выбары ў Грэцыі пройдуць 7 ліпеня



Пра гэтае рашэнне прэм'ер-міністра Грэцыі Алексіса Цыпраса паведаміў афіцыйны прадстаўнік урада Дзімітрыс Тзанакапулас у эфіры тэлеканала Alpha. Па яго словах, «рашэнне прэм'ер-міністра заключаецца ў тым, што выбары пройдуць 7 ліпеня, каб не парушаць працэс здачы школьных экзаменаў». Афіцыйны прадстаўнік кабінета таксама паведаміў, што 10 чэрвеня Алексіс Цыпрас наведае прэзідэнта краіны Пракопіса Паўлопуласа, каб той абвясціў аб правядзенні датэрміновых парламенцкіх выбараў. Як вядома, на выбарах у Еўрапейскі парламент кіруючая партыя СІРЫЗА кіраўніка ўрада саступіла з разгромнай розніцай у больш чым дзевяці працэнтных пунктаў галоўнай апазіцыйнай правацэнтрысцкай партыі «Новая дэмакратыя». Адначасова ў мінулую нядзелю праводзіўся і першы тур выбараў мэраў гарадоў, губернатараў рэгіёнаў і членаў муніцыпальных і рэгіянальных саветаў, на якіх у пераважнай большасці лідзіравалі кандыдаты ад «Новай дэмакратыі».

## Колькасць злачынстваў на глебе ксенафобіі ў Нью-Ёрку вырасла амаль удвая



Паліцыя Нью-Ёрка з пачатку года зарэгістравала 176 паведамленняў пра злачынствы, учыненыя на глебе рэлігійнай і расавай нянавісці, што на 83 працэнты больш, чым за аналагічны перыяд мінулага года. Пра гэта паведаміла газета The Wall Street Journal, спасылаючыся на звесткі за перыяд з 1 студзеня па 19 мая. Большая частка злачынстваў (103) насіла ярка выражаны антысеміцкі характар, паведаміла выданне, нагадаўшы, што летась было зафіксавана 50 такіх злачынстваў. У той жа час, паводле газеты, за ўчыненне злачынстваў на глебе нянавісці ў горадзе з пачатку года было арыштавана 65 чалавек. Улады Нью-Ёрка, горада з насельніцтвам 8,62 мільёна чалавек, дзе, паводле ацэнак, пражывае больш за мільён яўрэяў, прымаюць меры па барацьбе са злачынствамі на глебе нянавісці, адзначыла WSJ. Са студзеня гэтага года ў горадзе пачало дзейнічаць Упраўленне па прадухіленні злачынстваў на глебе нянавісці (Office of Hate Crime Prevention), створанае па ініцыятыве муніцыпалітэта.

# НАВУКОВА — ПРА ДУХОЎНАСЦЬ

### У Мінску сёння адкрываюцца Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія Чытанні

**Міжнародны форум адзначае сваё 25-годдзе. Мерапрыемства аб'ядноўвае навукоўцаў з розных краін свету, якія працуюць у сферы багаслоўя, гісторыі, філасофіі і рэлігіязнаўства. Чытанні за чвэрць стагоддзя сталі пляцоўкай для міжкультурнага і міжканфесійнага дыялогу, абмеркавання праблем духоўнасці і яе значэння для сучаснага грамадства.**

У адкрыцці і пленарным пасяджэнні ўдзельнічаюць кіраўнікі хрысціянскіх канфесій Беларусі, прадстаўнікі органаў дзяржаўнага кіравання, міністэрстваў, ведамстваў, дыпламатычнага корпуса і навуковых устаноў.

Тэма сёлетніх чытанняў — «Спадчына святых Кірыла і Мяфодзія ў сусветнай духоўнай культуры», а колькасць удзельнікаў — больш за 100 гасцей з краін СНД і далёкага замежжа.

Арганізатарамі юбілейнага форуму сёлета сталі Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Хрысціянскі адукацыйны цэнтр імя святых Мяфодзія і Кірыла», Мінскі міжнародны адукацыйны цэнтр імя Ёханеса Рау, Інстытут тэалогіі БДУ, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

Брэсць 1000 год!

# У ДОБРЫ ШЛЯХ!

**Гэта пажаданне прагучала на адрас новага аўтавакзала падчас яго ўрачыстага адкрыцця**

**Брэст сустракае свой значны юбілей увядзеннем у строй новых прыгожых і значных аб'ектаў. Шмат людзей сабралася на новым аўтавакзале. Акрамя пасажыраў сюды прыйшлі прадстаўнікі грамадскасці, гараджане, будаўнікі. Кампанія «Палессежылбуд» спраектавала і ўзвяла тэрмінал даволі хутка — за год. І цяпер прыгожы будынак са шкла і бетону ў стылі мадэрн стаў яшчэ адным упрыгажэннем горада.**



Новы аўтавакзал размяшчаецца побач з чыгуначным вакзалам, што вельмі зручна для пасажыраў, гасцей горада, шматлікіх турыстаў.

Ранейшы аўтавакзал, узведзены ў 1963 годзе ў цэнтры горада, стаў яго гісторыяй. У ноч на 28 мая ўсе службы пераехалі ў новы будынак, і вакзал змяніў сваю дыслакацыю. Яго прапускная здольнасць — да сямі тысяч пасажыраў. Транспарт прымаюць 13 пасадачных платформ. Цэнтральная частка пабудовы адведзеная пад залу чакання. У адным крыле знаходзяцца білетныя касы, у другім — кафэ, туалеты, камеры для багажу. На прывакзальнай плошчы размяшчаецца паркоўка на 88 месцаў. Інфармацыйныя стэнды і шыльды аформлены на беларускай, рускай і англійскай мовах.

Павіншаваць брастаўчан са знакавай падзеяй прыехаў **прэм'ер-міністр краіны Сяргей РУМАС:**

— Брэст актыўна рыхтуецца да тысячагоддзя. У адпаведнасці з распараджэннем кіраўніка дзяржавы да юбілею пабудавана ўжо 15 і будуецца яшчэ 13 аб'ектаў інфраструктуры. Аблічча горада змяняецца на вачах. Узводзяцца масты, праводзяцца ў парадак дарогі, добраўпарадкоўваюцца паркі, з'яўляюцца новыя сацыяльныя аб'екты. Сёння ў вас чарговае наваселле. Цяпер жыхароў горада і гасцей будзе праводзіць у дарогу і сустракаць прыгажун-аўтавакзал. Ён стане яшчэ адной візітнай карткай абласнога цэнтра, які з'яўляецца заходняй брамай краіны. Вакзал атрымаўся дастойным. Нездарма ж яго праект быў прызнаны адным з найлепшых на нацыянальным архітэктурным фестывалі, — адзначыў прэм'ер-міністр і выказаў падзяку архітэктарам, будаўнікам, усім, хто меў дачыненне да стварэння гэтага цудоўнага аб'екта.




**Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС** падкрэсліў зручнасць размяшчэння вакзала, яго функцыянальнасць, блізкасць да новага Заходняга абходу, які хутка ўвойдзе ў строй. Губернатар выказаў упэўненасць, што новую транспартную інфраструктуру ацэняць як гараджане, так і госці.

Сімвалічны ключ ад вакзала ўручыў гаспадарам **генеральны дырэктар ААТ «Палессежылбуд» Анатоль ПЯТРЫНІЧ.**

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота БелТА.**

# КАНІКУЛЫ — БЯСПЕЧНЫЯ І КАРЫСНЫЯ

**Падчас летняй кампаніі ў краіне будзе задзейнічана каля шасці тысяч аздараўленчых летнікаў, з іх 1,7 тысячы кругласутачных, 4,5 тысячы дзённага знаходжання, 143 стацыянарных загарадных кругласутачнага знаходжання, паведаміў Аляксандр МАЦЮШОНАК, намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення выхаваўчай работы і маладзёжнай палітыкі Міністэрства адукацыі.**

**Ганна БАНАДЫК, старшы інспектар па асаблівых даручэннях аддзела арганізацыі міжведамаснага ўзаемадзеяння і прапаганды бяспекі дарожнага руху УДАІ МУС,** расказала, што ў мэтах прафілактыкі і папярэджання дзіцячага дарожна-транспартнага траўматызму да 5 чэрвеня пройдзе акцыя «Увага, дзеці». Гутаркі наконт бяспечнага летняга адпачынку трэба праводзіць не толькі сярод дзяцей, але і з дарослымі.

— Часта бацькі забываюць пра тое, што да 12 гадоў дзеці павінны перавозіцца з выкарыстаннем трымаючых прылад. Крэсла або люлька павінны адпавядаць росту і вазе дзіцяці. Востра стаіць праблема перавозкі дзяцей-пасажыраў: 30 хлопчыкаў і дзяўчынак за апошнія чатыры месяцы сталі ўдзельнікамі здарэнняў, прычым кожны другі перавозіўся няправільна. Двое дзяцей загінулі, 28 атрымалі траўмы, — паведаміла Ганна Банадык.

**Ала МАЛАХАВА, загадчыца аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя,** адзначыла, што для здароўя дзяцей важна забяспечыць іх дастатковай працягласцю сну, здаровым правільным харчаваннем, рухальнай актыўнасцю і свежым паветрам. Для мінімізацыі хвароб важна своечасова прышчапляцца, бо апошнія два гады ў Беларусі перыядычна ўзнікаюць успышкі розных інфекцыйных захворванняў. На працягу апошніх некалькіх гадоў рэгіструецца актыўнасць кішачных інфекцый: вірусныя пераважаюць над бактэрыяльнымі. Праблемай для дзяцей з'яўляюцца і ўкусы кляшчоў: у 2018 годзе ў краіне зарэгістравана больш за дзве тысячы выпадкаў, і гэты паказчык з кожным годам павялічваецца.

**Дар'я ШЛАПАКОВА.**

Прыёмная кампанія — 2019

# Да заканчэння рэгістрацыі на ЦТ засталіся лічаныя дні!

**Абітурыентам, якія яшчэ не зарэгістраваліся на цэнтралізаванае тэсціраванне, варта паспяшацца. 1 чэрвеня ў 18 гадзін пункты рэгістрацыі закрыюцца.**

Як расказаў журналісту «Звязды» **начальнік вучэбна-метадычнага ўпраўлення Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Аляксандр ЯКАБЧУК,** па стане на 15 гадзін 29 мая свой намер удзельнічаць у цэнтралізаваным тэсціраванні аформілі ўжо больш за 67,4 тысячы чалавек: яны зарэгістраваліся на 226,8 тысячы чалавека-тэстаў. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года адставанне складае прыблізна 5 тысяч чалавек.

Традыцыйна самай масавай дысцыплінай на ЦТ будзе руская мова — на яе зарэгістраваліся ўжо больш за 55 тысяч чалавек. Для параўнання: беларускую мову выказалі жаданне здаваць 19 345 абітурыентаў. Другая па папулярнасці дысцыпліна — матэматыка (37 149 рэгістрацый). На фізіку аформлена ўжо 21 772 пропускі, на біялогію — каля 22 тысяч, гісторыю Беларусі — 17 705. **Здаваць гісторыю на роднай мове будуць толькі каля пяці працэнтаў ад агульнай колькасці тых, хто прайшоў рэгістрацыю. На іншых прадметах беларускую мову выбіраюць яшчэ менш абітурыентаў.**

Між іншым, выбар мовы, на якой абітурыент жадае здаваць тэсты, ажыццяўляецца яшчэ на этапе падачы заявы і рэгістрацыі на ЦТ. Заява запаўняецца ўдзельнікам ЦТ на адной з дзвюх дзяржаўных моў: беларускай ці рускай на выбар. Трэба мець на ўвазе, што пазней зона рэгістрацыі бланка адказаў будзе запаўняцца абітурыентам на той жа мове, на якой была пададзена заява пры рэгістрацыі. І сертыфікат удзельніка ЦТ будзе запаўняцца таксама на той мове, на якой падавалася заява.

У абітурыентаў ужо не першы год ёсць магчымасць здаваць на ЦТ чатыры дысцыпліны замест трох. Аляксандр Якабчук паведаміў, што на кожнага абітурыента прыпадае ў сярэднім 3,4 тэста. Хтосьці вырашыў здаваць і рускую, і беларускую мовы, каб потым выбраць лепшы з двух сертыфікатаў. Аляксандр Якабчук нагадаў, што да завяршэння рэгістрацыі, гэта значыць да 1 чэрвеня, у абітурыента ёсць права змяніць «камплект» экзаменацыйных дысцыплін. Для гэтага трэба звярнуцца ў пункт рэгістрацыі з пропускам па тым прадмеце, які трэба замяніць, і аформіць пропуск для ўдзелу ў ЦТ па іншай дысцыпліне. Другі раз аплачваць рэгістрацыйны ўзнос не патрабуецца. А вось калі абітурыент перадумаў здаваць ЦТ, то грошы яму не вяртаюцца. У выпадку страты пропуска на ЦТ таксама трэба звяртацца ў пункт рэгістрацыі, каб атрымаць яго дублікат.

**Трэба мець на ўвазе, што пропуск для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні лічыцца зарэгістраваным, калі на ім стаяць пячатка ўстановы, вызначанай пунктам рэгістрацыі на ЦТ, подпіс упаўнаважанага прадстаўніка пункта рэгістрацыі і ўказаны рэгістрацыйны нумар.**

У некаторых ВНУ на сённяшні дзень ужо цалкам запоўніліся месцы для праходжання абітурыентамі цэнтралізаванага тэсціравання па тых ці іншых прадметах. «Але абітурыентам хвалявацца не трэба, — заспакойвае Аляксандр Якабчук, — без месца яны дакладна не застануцца. Аўтаматызаваная сістэма рэгістрацыі працуе па прынцыпе «аднаго акна»: сама шукае пасадачныя месцы і падказвае рэгістратару, у якіх навучальных установах можна здаць тыя ці іншыя прадметы».

Першае ЦТ абітурыенты будуць здаваць 11 чэрвеня па беларускай мове. ЦТ па рускай мове пройдзе 13 чэрвеня.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Будзь у курсе!

# НА МАГІСТРАЛІ — НОВЫ КАНАЛ СУВЯЗІ

## Для пасажыраў з парушэннямі слыху

**У мэтах паляпшэння якасці абслугоўвання пасажыраў з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі Беларуская чыгунка сумесна з ГА «Беларускае таварыства глухіх» арганізавала новы канал сувязі праз прыкладанне Skype.**

Каб пасажыру з парушэннем слыху атрымаць неабходную інфармацыю або дапамогу па аказанні паслуг чыгуначнага транспарту, яму трэба, выкарыстоўваючы праграму Skype, па спасылках, размешчаных на афіцыйным сайце БЧ www.rw.by ў раздзеле «105 Кантакт-цэнтр», звязацца на мове жэстаў са спецыялістам Беларускага таварыства глухіх. У сваю чаргу, інфармацыю, якая зацікавіла кліента, спецыялісту Беларускага таварыства глухіх у анлайн-рэжыме паведаміць аператар Кантакт-цэнтра Беларускай чыгункі.

Праведзеная работа скіравана на павышэнне даступнасці чыгуначнага транспарту для асоб з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і з'яўляецца працягам функцыяналу адзінага тэлефоннага нумара падтрымкі пасажыраў 151, паведамілі ў прэс-службе магістралі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Вышэйшая школа

# Дыплом + дадатковыя магчымасці

**У новым навучальным годзе студэнты БДУ змогуць дадаткова вывучаць прадметы па выбары, якія пашыраць набор іх прафесійных кампетэнцый, што, у сваю чаргу, можа павялічыць шанцы на рынку працы. Скарыстацца такой магчымасцю змогуць студэнты любога курса, а таксама магістранты ўсіх факультэтаў БДУ без выключэння. Па выніках станоўчай бягучай атэстацыі абраныя курсы будуць унесены ў дадатак да дыплома.**



Ацэнка падрыхтоўкі студэнта будзе адбывацца згодна з дзеючымі Правіламі правядзення атэстацыі студэнтаў, курсантаў, слухачоў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі. У выпадку атрымання нездавальняючай адзнакі або «не залічана» студэнту можа быць выдадзена даведка аб праслуханай вучэбнай дысцыпліне без унясення адпаведных звестак у дыплом.

Навучанне па дадатковых дысцыплінах не абмяжоўваецца вучэбным курсам. Гэта значыць, што першакурснік пры жаданні зможа абраць тыя, якія вывучаюцца на чацвёртым годзе падрыхтоўкі.

У рамках пілотнага праекта нароўні з вочным наведваннем заняткаў плануецца актыўнае выкарыстанне анлайн-фарматаў па шэрагу дысцыплін. Дыстанцыйны фармат дазволіць індывідуалізаваць працэс навучання, забяспечыць мабільнасць пры вывучэнні матэрыялаў і выкананні заданняў. Дыдактычны матэрыял па шэрагу дысцыплін будзе размешчаны на адукацыйнай платформе LMS Moodle. На дадзены момант гэта база змяшчае больш за 500 відэалекцый, канферэнцый, вебінараў, практычных трэнажораў, анлайн-трэнінгаў, інтэрнэт-семінараў, тэстаў і іншых матэрыялаў. Яе тэхнічныя магчымасці дазваляюць выкладчыку кансультаваць студэнтаў, правяраць выкананне заданняў, арганізоўваць самастойную работу і ў хуткім рэжыме забяспечваць вучэбным матэрыяламі.

У найбліжэйшы час у БДУ плануецца запусціць платформу электроннага раскладу. Яна дазволіць студэнтам з улікам абраных імі дадатковых дысцыплін сфарміраваць графік наведвання заняткаў і суаднесці яго з заняткамі па асноўнай спецыяльнасці.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

На прапусці!

# Самаробны гульнявы аўтамат, светлавы меч і лодка

## Аматараў тэхнікі запрашаюць на свята робататэхнікі і вынаходніцтва

**Мінскі адкрыты робатурнір і «Maker Fest» пройдуць у «БелЭкспа» 31 мая — 2 чэрвеня. За званне найлепшых робатэхнікаў на VII Мінскім адкрытым турніры пазмагаюцца больш за 1000 удзельнікаў з розных гарадоў Беларусі, Расіі, Казахстана і краін Балтыі. Яго арганізатарамі выступаюць Асацыяцыя «Адукацыя для будучыні» і адукацыйны цэнтр «100 балаў».**

Максімальная ўзроставая планка для тых, хто хоча паспрабаваць свае сілы на гэтых спаборніцтвах, фактычна не ўстаноўлена, таму ў некаторых катэгорыях могуць паўдзельнічаць і дарослыя, якія захапляюцца робататэхнікай. А самымі юнымі ўдзельнікамі стануць навучэнцы 1—4-х класаў.

VII Мінскі адкрыты робатурнір — самае папулярнае і масавае ў Беларусі мерапрыемства для тых, хто цікавіцца адукацыйнай робататэхнікай і тэхнічнай творчасцю, дзе пануе таварыская, крэатыўная і нефармальная атмасфера. Штогод ён набірае абароты. Калі летась у ім удзельнічалі 550 чалавек, то сёлета колькасць ахвотных выступіць на ім павялічылася ўдвая.



Спаборніцтвы будуць доўжыцца з 31 мая да 2 чэрвеня. А **1 чэрвеня ў рамках VII Мінскага адкрытага робатурніра ў Нацыянальным выставачным цэнтры «БелЭкспа» адбудзецца кірмаш тэхнічных вынаходак «Maker Fest».** Яго мэта — сабраць у адзінай крэатыўнай прасторы найбольш цікавыя ўзоры інжынерна-тэхнічнай творчасці, даць магчымасць беларускім мейкерам прадэманстраваць на публіцы ўласныя напрацоўкі, пакантактаваць адно з адным і захапіць мейкерствам юнае пакаленне.

На фестывалі будзе прадстаўлена больш за 40 унікальных экспанатаў як DIY, так і DIWO-вытворчасці: 3D-прынтары, гульнявы аўтамат і Linux-тэрмінал у рэтрастылі, фантастычны светлавы меч, лодка, якая фатаграфуе качак і чаек, праект «Space Invaders stand», самыя розныя незвычайныя робаты і многае іншае. Акрамя таго, у рамках выстаўкі пройдзе некалькі практычных майстар-класаў па Arduino і 3D-друку для дзяцей і падлеткаў.

Госці кірмашу змогуць пагутарыць з мейкерамі, убачыць, як працуюць экспанаты, і задаць свае пытанні. Білет на фестываль і турнір не патрабуецца — уваход вольны.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Наш падыход

**Колькі ў Беларусі хворых на ВІЧ-інфекцыю**

# Не баяцца свайго статусу

**...Таццяна (імя гераіні па этычных меркаваннях зменена) мае за плячыма больш чым 15-гадовы стаж ужывання наркотыкаў. І пачыналася ўсё тады, калі яна мела работу і аўтамабіль, а ў канцы гэтага шляху не засталося ні дакументаў, ні жылля, да таго ж з'явіўся станоўчы статус на ВІЧ. Але гісторыя скончылася ўдала: жанчына больш не ўжывае наркотыкі, прымае прэпараты, якія дазваляюць паўнавартасна жыць з вірусам, мае пастаянную работу і дапамагае таксама тым, якой калісьці была сама.**

— Ужо тры гады я не ўжываю наркотыкі. Пачалося ўсё з таго дня, калі я апынулася ў дроп-ін-цэнтры. Прычым прыйшла не па шпрыцы — іх мне прынасіў сусед. Проста даведалася, што тут можна атрымаць адзенне. У мяне спыталі, ці ела я сёння... Для чалавека, які нікому не патрэбны, вельмі важна, калі ёсць месца, дзе можна паесці, памыць і пасушыць адзенне. Я выйшла з цэнтра з невялікім пакецікам рэчаў, але мне не было куды ісці. Раней у мяне памерла маці, ніякага жылля не было, я начавала ў прытонах. Сацыяльныя работнікі хутка знайшлі, дзе мне пераначаваць.

У цэнтры Таццяна даведалася і пра свой станоўчы статус на ВІЧ.

— Да ўрачоў я тады не дайшла, бо трэба было шмат часу на гэта патрацізь. Я баялася, як будуць да мяне ставіцца медыкі, усё ж такі ў нашым грамадстве існуе стыгма ў адносінах да ВІЧ-інфікаваных і наркаманаў. Каб атрымліваць РВТ-прэпараты (рэтравірусная тэрапія. — **Аўт.**), існуе шмат бар'ераў — іх не пад сілу пераадолець чалавеку, які ўжывае наркотыкі.

Сацыяльныя работнікі парэкамендавалі Таццяне рэабілітацыйны цэнтр «Выток». Там яна адчула, што можа справіцца з залежнасцю. Перастала ўжываць наркотыкі і ўладкавалася на работу. Стала прымаць рэтравірусную тэрапію, якая падаўляе вірус імунадэфіцыту настолькі, што чалавек можа весці паўнавартаснае жыццё.

— Многія мае знаёмыя прыйшлі ў дроп-ін-цэнтр пасля мяне. Не ва ўсіх ёсць жаданне вылечыцца. Але важна, што тут дапамагаюць любому чалавеку.

Адзіны ў краіне дроп-ін-цэнтр размешчаны ў Фрунзенскім раёне Мінска на вуліцы Матусевіча, 23. Тут можна атрымаць шпрыцы і прэзервативы, адзенне і абутак, зрабіць экспрэс-тэст на ВІЧ, праканcультавацца з сацыяльным работнікам (як правіла, былым нарказалежным), нарколагам і інфекцыяністам, юрыстам, зрабіць ксеракопіі дакументаў і атрымаць дапамогу ў іх аднаўленні. Штогод праз цэнтр праходзяць 22—24 тысячы наркаўжывальнікаў. Акрамя гэтага, у нашай краіне працуе дзевяць мабільных пунктаў, дзе нарказалежныя таксама могуць атрымаць дапамогу.

Днямі цэнтр наведала **в. а. выканаўчага дырэктара праграмы развіцця ААН Юнэйдс Гуніла КАРЛСАН**, якая прыехала ў Беларусь у межах Рэгіянальнай нарады Unaids краін Усходняй і Цэнтральнай Еўропы. Яна ацаніла поспехі Беларусі ў прадухіленні распаўсюджання ВІЧ/СНІД. Нагадаем, што наша краіна ставіць перад сабой амбіцыйную задачу — дасягнуць эпідэмічнага дабрабыту па ВІЧ-інфекцыі да 2023 года. У прыватнасці, актыўна працуе ў межах Глабальнай мэты Аб'яднанай праграмы ААН па ВІЧ/СНІД «90-90-90».

— Калі мы кажам пра мэты 90-90-90, маем на ўвазе тры асноўныя параметры. У першую чаргу, каб 90 % хворых ведалі свой станоўчы ВІЧ-статус, па-другое, каб 90 % з іх атрымлівалі адпаведную тэрапію. І канешне, важна, каб 90 % з іх дасягалі зніжэння вірусная нагрузкі да невызначальнага ўзроўню. І тут трэба працаваць з ключавымі групамі насельніцтва і забяспечваць для гэтых людзей роўныя магчымасці і доступ да адпаведных паслуг. Як я бачу, Беларусь робіць вялікія поспехі, і мяне гэта вельмі радуе, — адзначае Гуніла Карлсан.

Яна падкрэсліла, што Беларусь цікавая сваім комплексным падыходам, а таксама работай з ключавымі групамі, якія маюць найбольшую рызыку заражэння. Гэта тыя, хто ўжывае ін'екцыйныя наркотыкі, людзі секс-бізнесу і мужчыны, якія практыкуюць секс з мужчынамі.

Як адзначыла намеснік міністра аховы здароўя, галоўны дзяржаўны санітарны ўрач Наталля Жукава, за апошнія два гады ўдалося ўцягнуць у лячэнне значную частку ВІЧ-інфікаваных — колькасць такіх павялічылася на 24 %. Сёння пра свой станоўчы статус ведае каля 82 % хворых. Амаль 77 % з іх прыхільныя да лячэння.

**Алена КРАВЕЦ.**

**У Беларусі выяўлена каля 21,6 тысячы ВІЧ-інфікаваных, а па ацэначных лічбах станоўчы статус мае 26 тысяч беларусаў. У нашай краіне пераважае палавы шлях перадачы інфекцыі (больш за 82 % выпадкаў). Найбольшая колькасць выпадкаў рэгіструецца ва ўзроставай групе ад 30 да 44 гадоў. У структуры хворых з кожнага дзесятка шэсць чалавек — мужчыны. У параўнанні з 2017 годам кошт рэтравіруснай тэрапіі знізіўся ў 5—6 разоў, хворыя ў нашай краіне атрымліваюць прэпараты бясплатна.**

# ДНК РАСКРЫВАЕ САКРЭТЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Адзін з найважнейшых кірункаў працы судовых генетыкаў — раскрыццё цяжкіх і асабліва цяжкіх злачынстваў мінулых гадоў. Гэта ні ў якім разе не камень у агарод тагачаснага следства. Эксперты былі выкананы на належным узроўні, але... адносна таго часу, калі яны праводзіліся. Многіх метадаў, праграмных комплексаў і прыбораў, якія ўзяты на ўзбраенне генетыкамі зараз, тады не існавала ў прыродзе. Дакладнасць аналізу таксама павялічылася. Параўнаць гэта можна з эвалюцыяй камп'ютарнай тэхнікі — магчымасці перадавых машын 1990-х зараз у большасці людзей выклічуць хіба што ўсмешку. І, акрамя таго, быў створаны банк даных генатыпаў. Такім чынам, старыя экспертызы чымсьці нагадваюць міну запаволенага дзеяння датычна злачынцы. Калі яна спрацуе — невядома нікому. А як вядома, адзін з галоўных прынцыпаў юрыспрудэнцыі — непазбежнасць пакарання за зробленае. Так, за 2018 год такіх экспертыз было зроблена больш за 300.

— У 1999 годзе ў адным з раённых цэнтраў Брэсцкай вобласці быў знойдзены труп непаўнагетняй дзяўчынкі з ранамі ў вобласці шыі і прыкметамі згвалтавання, — згадвае Вікторыя Корбан. — Доўгі час злачынства было нераскрытым. Але ў пачатку 2017 года следчыя вырашылі перагледзець усе дакументы і рэчавыя доказы, якія былі сабраны па гэтай крымінальнай справе. Экспертызу прызначылі ў наш аддзел. Дзякуючы вельмі карпатлівым даследаванням удалося высветліць генатып злачынцы па слядах, якія ён пакінуў. Але хто менавіта згвалтаваў і забіў дзяўчынку, так і заставалася невядомым. Аднак цяпер паўза аказалася вельмі нядоўгай. Літаральна праз паўгода ішла праверка людзей у прыналежнасці да новага злачынства. І... адбылося так, што генатып супаў. Праверылі некалькі разоў, але камп'ютар упарта паказваў адзін і той жа вынік. Расследаванне той справы было адноўлена, і летась яе перадалі ў суд.

Другі паказальны выпадак датычыцца вельмі цяжкага злачынства, здзейсненага яшчэ ў 1991 годзе. Быў знойдзены труп васьмігадовай дзяўчынкі ў адным з абласных цэнтраў Беларусі. У той час судовая генетыка ўжо пачала пакрысе пранікаць у СССР. Але экспертызы былі адзінкавымі і праводзіліся толькі ў Маскве. Узоры біяматэрыялаў адпраўляліся і туды, і ў ФРГ, дзе развіццё генетыкі ішло сямімільнымі крокамі. Але нічога, што магло б зацікавіць следства, знойдзена, на жаль, не было. У 2016 годзе экспертыза па рэчавых доказах зноў даследавала тое, што засталося ад узятых проб. Быў атрыманы генатып двух мужчын, які супаў з тымі, што меліся ў базе.

— Тут трэба адзначыць адзін істотны момант, — кажа Вікторыя Корбан. — Справа ў тым, што раскрыццё злачынстваў, учыненых дзесяцігоддзі таму, дзеліцца на два кірункі. Першы з іх — работа з дакументамі. Скажам, быў адабраны біяматэрыял, высветлены генатып чалавека, але ідэнтыфікаваць, хто гэта, немагчыма. Але хто ведае, ці не адбудзецца супадзенне пры паступленні новых матэрыялаў?

Другі кірунак — гэта калі экспертыза перарабляецца нанова з улікам новых тэхнічных магчымасцяў. Праўда, тут ёсць адзін вельмі важны нюанс. Працаваць са старымі рэчавымі доказамі вельмі складана. За дзесяцігоддзі разбураецца сама ДНК, час не шкадуе матэрыялы, на якіх яна знаходзіцца. Ды і самога матэрыялу пасля ранейшых даследаванняў застаецца, як правіла, няшмат. Але вынікі гэта ўсё ж прыносіць.

Генетыкам даводзіцца працаваць і тэрмінова, асабліва калі злачынства раскрываецца па гарачых слядах.

— 29 снежня 2017 года ў Мінску быў знойдзены труп пажылой жанчыны, — згадвае суразмоўца. — Злачынца ўдарыў яе нажом у пад'ездзе і абрабаваў. Гэта адбылося ў апошні працоўны дзень года, калі работа лабараторыі ўжо згортвалася. Але падчас агляду былі знойдзены ножны ад кінжала. На наступны дзень эксперт прыйшоў у лабараторыю і за дзень высветліў генатып чалавека, які трымаў ножны. Дзякуючы гэтаму атрымалася выйсці на падазраванага.



Фота з сайта sudexpert.gov.by

Трэба адзначыць, што візуальны кантроль зараз зведзены да мінімуму, цяпер усю ступень супадзення выдае камп'ютар. Стапрацэнтнага падабенства не можа існаваць у прыродзе. Але сучасныя методыкі дапускаюць верагоднасць выпадковага супадзення з імавернасцю, якая вымяраецца лікам 10 у ступені мінус 22. Дастаткова сказаць, што за ўсю гісторыю Зямлі на ёй жыло куды менш людзей.

Разам з тым судовыя генетыкі займаюцца не толькі даследаваннямі, звязанымі з крымінальнымі справамі. Напрыклад, яны таксама высвятляюць бацькоўства.

— Даводзіцца назіраць і за трагікамедыямі чалавечага жыцця, — заўважае эксперт. — Напрыклад, легендай стала жанчына, якая не магла высветліць, хто з двух мужчын з'яўляецца бацькам яе сына. Мушу зрабіць рэмарку, што без судовай пастановы мы можам займацца генетычнай экспертызай на платнай аснове для ўсіх ахвотных, але выключна на аснове асабістай заявы. І аказалася, што насамрэч бацькам малога... не з'яўляецца ніводны з двух, так бы мовіць, прэтэндэнтаў. Можаце толькі ўявіць сабе іх эмоцыі... Увогуле, калі ўзяць справы датычна бацькоўства (а іх ужо пяцьсот), то аказваецца, што прыкладна кожная шостая экспертыза паказвае, што тата не той... Але гэта датычыцца толькі тых, хто мае сумненні ў сваім бацькоўстве.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Спецыяльны рэпартаж

# «МНЕ ПРЫЕМНА, ШТО Я ПРЫНОШУ ЛЮДЗЯМ РАДАСЦЬ»

## З такім настроем працуе мінскі паштальён Яўген ДАРЫЕНКА

Гістарычна склалася, што паштальён у нашых краях — прафесія жаночая. Але ёсць з гэтага правіла і выключэнні. Напрыклад, у 36-м аддзяленні паштовай сувязі ў Мінску лісты, газеты і іншыя адпраўленні разносіць былы вайсковец Яўген Дарыенка. З ім па штодзённым маршруце паштальёна і прайшлі карэспандэнты «Звязды».

— Пятніца на пошце — гэта даволі напружаны дзень, — усміхаецца паштальён. — Перад выхаднымі збіраецца вельмі шмат лістоў. Ды і шмат газет выходзіць у пятнічным фармаце — асабліва тыя, якія змяшчаюць тэлепраграму.

Раён, дзе працуе Яўген Дарыенка, — гэта кварталы хрушчовак непадалёку ад мінскай станцыі метро «Грушаўка». Там жыве шмат пенсіянераў, якія не адмаўляюцца ад друкаванага слова. Імклівы рытм сталіцы тут амаль не адчуваецца. Ціхія і прасторныя двары спрыяюць таму, каб аднагчасова з дастаўкай паштовай карэспандэнцыі яшчэ і зарадзіцца добрым настроем падчас шпацыру.

— Во калі б вы прыйшлі а 7-й гадзіне раніцы, то ўбачылі б поўную сумку. Часам вага даходзіць да 8 кілаграмаў. І то гэта дзякуючы апорным скрыням, дзе кіроўцы пакідаюць частку газет, каб нам не даводзілася цягаць на сабе яшчэ большую вагу. А яшчэ няпросты дзень — панядзелак. У гэты дзень, як правіла, газеты не выходзяць. Але збіраецца шмат карэспандэнцыі — лістоў, дробных пакетаў і гэтак далей.

Яўген Дарыенка працуе на пошце крыху больш за год. Ён уладкаваўся сюды ў пачатку мінулага красавіка. Сам ён зараз на пенсіі.

— Было вельмі сумна сядзець дома без работы. Паступалі прапановы пайсці вучыцца на камп'ютарныя курсы. Але я адчуваю, што гэта не маё. Мне падабаецца гутарыць з людзьмі, прыносіць ім радасць. Таму я і прыйшоў на пошту. Праўда, спачатку наслухаўся



Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

добрых жартаў кшталту знакамітай сцэны з кінакамедыі Гайдая: «А дзе бабуля?» — «Я за яе». Непрыемна, праўда, калі нябесная канцылярыя прыносіць сюрпрызы ў выглядзе моцных ападкаў. А калі, як цяпер, свеціць сонца, то хадзіць па ўчастку заўжды ў радасць.

Паштальён неяк падлічыў, колькі ён праходзіць за дзень. Атрымалася недзе каля 20 кіламетраў. Рэч у тым, што раён у той мясцовасці падзелены на дзве няроўныя часткі: жылы сектар і прамысловую зону. А самая крайняя кропка ўчастка знаходзіцца наводшыбе. Гэта будаўнічае ўпраўленне ААТ «МАПІД». Каб туды трапіць, трэба прайсці праз мост. А паколькі юрыдычныя асобы вядуць даволі актыўную перапіску, то ў паштальёна і набягае такі кіламетраж. І тут вельмі дарэчы прыйшліся заняткі па страявой падрыхтоўцы.

Тым часам мы заходзім у адзін з пад'ездаў.

— О, адрамантавалі жыхары адной з кватэр замок! — радуецца Яўген Дарыенка. — Вось і атрымаюць газету вельмі хутка.

На наш запытальны позірк паштальён тлумачыць:

— Усе мы — і работнікі пошты, і звычайныя жыхары, —





не раз сустракаліся з адчыненымі асабістымі паштовымі скрынкамі. На гэты конт існуе падрабязнае правіла. Калі мы гэта ўбачылі першы раз, то абавязаны падняцца ў кватэру, да якой гэтая скрынка адносіцца, і ўручыць адпраўленне з рук у рукі. А заадно і папярэдзіць, што наступны раз у паштовай скрынцы будзе не ліст або газета, а паведамленне пра тое, што карэспандэнцыя чакае на пошце. Гэта зроблена для дабра саміх жа жыхароў, каб іх перапіска не трапіла ў чужыя рукі. Месцы, дзе адкрыты скрынкі, я ведаю на памяць. І што прыемна, дык тое, што большасць такіх пытанняў вырашаецца вельмі хутка: дастаткова прыйсці на пошту, аплаціць невялікую суму — кошт складае недзе каля 5 рублёў, — і слесар аператыўна паставіць замок.

За год працы Яўген Дарыенка пазнаёміўся з многімі жыхарамі Грушаўкі.

— Напрыклад, ёсць некалькі старых, якія не могуць перасоўвацца без хадункоў. Уявіце сабе, наколькі складана ім выйсці на вуліцу ў хрушчоўцы, дзе ліфта няма! Я гэтыя адрасы даўно вывучыў і прыношу карэспандэнцыю проста ў кватэру. Як жа прыемна бачыць радасць у вачах тых, каму ты дапамагаеш трымаць сувязь з вялікім светам!

А вось, напрыклад, заказныя лісты аддаю толькі пасля таго, як адрасат пакажа пашпарт, — для мяне, як для былога вайскоўца, парадак перш за ўсё. Вось толькі было складана спачатку прывыкнуць да таго, што дамы бываюць розныя — як 4, так і 5 паверхаў у вышыню. Хрушчоўкі ж тут у нас аднатыпныя, і таму па нумары кватэры можна адразу сказаць, які гэта пад'езд.

Праўда, у некаторыя з іх трапіць не вельмі і проста. Скажам, кампанія, якая абслугоўвае дамафон, змяніла код доступу і паведаміла пра гэта не адразу. А пошта чакаць не можа. У выніку гэта дастаўляе пэўныя нязручнасці.

З выкарыстаннем кодаў ёсць і казусы. Звычайна гэта камбінацыя з чатырох лічбаў, як пін-код на банкаўскай картцы. Але на вуліцы Лермантава ёсць адзін дом, дзе код дамафона чамусьці пачынаецца з лічбы, пасля якой трэба націснуць кнопку званка і ўвесці пасля гэтага яшчэ некалькі лічбаў. І ўсё б нічога, але гэты пад'езд... першы. А гэта значыць, што ў кватэру абавязкова пойдзе званок, нават калі туды сёння паштальён нічога і не нясе.

Яшчэ мы сутыкаемся з тым, што некаторыя людзі доўгі час не забіраюць дробныя пакеты. Часам іх збіраецца па пяць і болей штук. Любое адпраўленне захоўваецца месяц, а пасля будзе вернута адпраўніку. Але наш працоўны дзень і пачынаецца з таго, што мы правяраем усё тое, што засталося незапатрабаваным ад мінулых дзён, пакуль не прыйшла машына з новай поштай.

І тут мы ў адным з чарговых двароў сустракаем жанчыну, якая вітаецца з Яўгенам Дарыенкам.

— О, як добра, што я вас убачыла. Якраз на завод іду. Мне там нічога не прыходзіла?

— Ёсць сёе-тое. Але там заказныя лісты, таму патрабуецца пашпарт. Не магу без дакумента аддаць. Не хвалюйцеся, данясём усё ў тэрмін! — усміхаецца паштальён.

...Мы развітваемся з Яўгенам Дарыенкам у самым сэрцы Грушаўкі побач з дыспетчарскай станцыяй «Лермантава». Напрыканцы пытаемся пра тое, ці ёсць у паштальёнаў якія-небудзь прыкметы.

— Такіх спецыфічных і няма. Праўда, ёсць пару дамоў, куды жыхары носяць ваду з калонкі. На пустыя вёдры трапляў, але на мяне гэта не ўплывала. Ды і што прыкметы! Галоўнае, каб кожны чалавек быў на сваім месцы і з павагай адносіўся да іншых. Тады і свет будзе дабрэйшы.

Профі

## Са «Звяздою» па жыцці!

Аператар сувязі Петрыкаўскага ўчастка паштовай сувязі Калінкавіцкага вузла паштовай сувязі Гомельскага філіяла РУП «Белпошта» Святлана ГОРБАЧ перакапана: газета «Звязда» — цудоўны выбар.



Фота Алены ДАЎЖАНОК

## Маркі да Еўрапейскіх гульняў



Выдавецкі цэнтр «Марка» РУП «Белпошта» пры садзейнічанні Дырэкцыі ІІ Еўрапейскіх гульняў выпусціў разнапланавую паштовую прадукцыю, прымеркаваную да кантынентальнага спартыўнага форума, у тым ліку мастацкія маркіраваныя і немаркіраваныя карткі, маркіраваныя канверты, сувеніры. Свет убачылі і чатыры паштовыя маркі, на якіх прадстаўлены папулярныя і відовішчныя віды спорту. Колеравая гама марак перагукаецца з сімволікай ІІ Еўрапейскіх гульняў. Гэта іх лагатып і слоган «Яркі год, яркі ты».

Між іншым, пры дапамозе тэхналогіі дапоўненай рэальнасці для гэтых марак распрацоўваецца спецыяльны сцэнарый. Убачыць яго можна будзе, выкарыстаўшы бясплатную мабільную праграму AR MARKA BELARUS. Пры навядзенні на марку камеры смартфона з'явіцца 3D-малюнак.

А спецыяльнае гашэнне пройдзе з 21 да 30 чэрвеня — падчас саміх гульняў — на Галоўпаштамце.

Факт

## «ВЯЛІКІ КАМЕНЬ» НА КАНВЕРЦЕ

Рашэннем беларуска-кітайскага міжурадавага камітэта па супрацоўніцтве 2019 год быў абвешчаны Годам адукацыі Беларусі ў Кітаі. Ён накіраваны на тое, каб наладзіць непасрэдныя стасункі паміж універсітэтамі дзвюх краін, развіваць супрацоўніцтва ў галіне адукацыі і навуковых даследаванняў, стварыць цэнтры вывучэння Беларусі ў вышэйшых навучальных установах Кітая. «Разыначка» Года адукацыі — пачатак вывучэння беларускай мовы ў кітайскіх ВНУ.

Таму беларускія паштавікі падрыхтавалі і выпусцілі памятны паштовы канверт. Цырымонія гашэння з удзелам генеральнага дырэктара РУП «Белпошта» Уладзіміра Матусевіча, міністра адукацыі Беларусі Ігара Карпенкі і намесніка міністра адукацыі КНР Цянь Сюэцзюня прайшла ў мінскай ратушы.

На канверце знайшлі сваё адлюстраванне дзяржаўныя сцягі Беларусі і Кітая, а таксама сімвал праекту «Вялікі камень». Словы «Адукацыя — шлях да развіцця» і «Год адукацыі Беларусі ў Кітаі» надрукаваны на беларускай і кітайскай мовах.

Дызайнер канверта — Алена Мядзведзь. Ён выпушчаны тыражом у 50 тысяч экзэмпляраў.



Фота БелТА.

Матэрыялы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ЛЕТС» («LET`S»)

Настоящие Правила проведения рекламной игры «ЛЕТС» («LET`S») (далее – Правила) разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями), и определяют порядок проведения рекламной игры «ЛЕТС» («LET`S») (далее – Рекламная игра).

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

юридическим лицом Республики Беларусь или индивидуальным предпринимателем – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования;

иностранным юридическим лицом — копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованные в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

иностранным гражданином или лицом без гражданства — документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, при необходимости легализованный в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык;

представителем заявителя (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель) – доверенность, выданную в установленном законодательством порядке, при необходимости легализованную в установленном порядке, с нотариально заверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица также – документ, подтверждающий его полномочия.

Консолидированными участниками для участия в аукционе к соответствующему заявлению прилагаются следующие документы:

копия договора о совместном участии в аукционе с предъявлением оригинала этого договора;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка на расчетный счет, указанный в извещении, с отметкой банка;

копии документов, подтверждающих государственную регистрацию индивидуальных предпринимателей и (или) микроорганизаций, заключивших договор о совместном участии в аукционе;

сведения о средней численности работников микроорганизаций, заверенные подписью руководителя.

При подаче документов уполномоченное лицо (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, и доверенности, выданные индивидуальными предпринимателями и (или) микроорганизациями, заключившими договор о совместном участии в аукционе. Представителем уполномоченного лица дополнительно предъявляется доверенность, выданная в установленном законодательством порядке, либо документ, подтверждающий полномочия руководителя.

По заявлению победителя аукциона (претендента на покупку) Минским городским исполнительным комитетом предоставляется рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка. Указанное заявление подается победителем аукциона (претендентом на покупку) в Минский городской исполнительный комитет не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона (далее – протокол). Решение о предоставлении рассрочки внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка принимается Минским городским исполнительным комитетом в течение 5 рабочих дней со дня получения заявления о предоставлении рассрочки.

Рассрочка внесения платы за право заключения договора аренды земельного участка предоставляется в порядке, установленном решением Минского городского исполнительного комитета от 30.04.2009 № 1015 «Об утверждении Инструкции о порядке внесения платы за право заключения договоров аренды земельных участков или платы за земельные участки, предоставляемые в частную собственность».

В течение 10 рабочих дней после утверждения в установленном порядке протокола победитель аукциона (претендент на покупку) обязан внести плату (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения Минским городским исполнительным комитетом) за право заключения договора аренды земельного участка, возместить затраты на организацию и проведение аукциона и выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка. Размер возмещаемых затрат доводится до сведения участников аукциона до начала его проведения.

После совершения победителем аукциона (претендентом на покупку) указанных действий и представления организатору аукциона, продавцу и в Минский городской исполнительный комитет копий платежных документов, но не позднее 2 рабочих дней, с ним в установленном порядке в соответствии с условиями аукциона продавцом заключается договор купли-продажи недвижимого имущества. В тот же срок Минский городской исполнительный комитет передает победителю аукциона (претенденту на покупку) выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, выдает экземпляр протокола и заключает с ним договор аренды земельного участка.

Рассрочка оплаты недвижимого имущества может быть предоставлена покупателю по его письменному заявлению на срок не более одного года со дня заключения договора купли-продажи с ежемесячной индексацией платежей по решению продавца по согласованию с соответствующим государственным органом.

Информация об аукционе и предмете аукциона дополнительно размещена на официальных интернет-порталах Минского городского исполнительного комитета (www.minsk.gov.by) и Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь (www. gki.gov.by)

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### *4 июля 2019 года в 10.00* в малом зале Гомельского районного исполнительного комитета, расположенного по адресу: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, состоится аукцион по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков

| Номер лота | Кадастровый номер и адрес земельного участка, его размеры, целевое назначение, характеристика инженерных коммуникаций, условия предоставления | Начальная цена предмета аукциона*, бел. руб. | Расходы по организации и проведению аукциона, подлежащие возмещению победителем аукциона, и **дополнительно** расходы, связанные с публикацией объявления, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| Земельные участки, предоставляемые **в частную собственность для коллективного садоводства** (земельные участки для коллективного садоводства). Гомельская обл., Гомельский район, Поколюбичский сельсовет, садоводческое товарищество «Жемчужная поляна». Имеется возможность подключения электроснабжения | | | | |
| 1 | Участок № 52 к/н 321084800019000091, площадь 0,0952 га<br>Ограничения (обременения) прав на земельный участок на площади<br>0,0952 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов);<br>0,0035 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей) | 6 111,84 | 1052,80 | 612,00 |
| 2 | Участок № 53 к/н 321084800019000092, площадь 0,0953 га<br>Ограничения (обременения) прав на земельный участок: на площади<br>0,0953 га – на природных территориях, подлежащих специальной охране (водоохранная зона рек и водоемов);<br>0,0040 га – в охранных зонах объектов инженерной инфраструктуры (в охранных зонах электрических сетей) | 6 118,26 | 1077,48 | 612,00 |
| Земельные участки, выставляемые **на право заключения договоров аренды** земельных участков **сроком на 49 лет** | | | | |
| 3 | Земельный участок на право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,0468 га, расположенного по адресу: Гомельский район, Приборский сельсовет, д. Прибор, ул. Мира, для строительства и обслуживания торгового павильона по реализации товаров повседневного спроса и продуктов питания | 825,95 | 1550,70 | 83,00 |

Организация, которая предоставляет информацию о месте размещения земельных участков, которые предполагается передать в аренду, частную собственность по результатам аукциона: управление землеустройства Гомельского районного исполнительного комитета г. Гомель, ул. Ильича, д. 51а, кабинет 123, телефон для справок 8 0232 53 15 21.

Условия предоставления земельных участков: в течение двух месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона обеспечить государственную регистрацию земельного участка, прав, ограничений (обременений) прав на него; в течение одного года со дня государственной регистрации возникновения права на земельный участок приступить к занятию земельного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления, по мере изменения фактического состояния и характера использования земель обратиться в райисполком для внесения сведений в государственный земельный кадастр сведений об изменении видов земель.

Задаток вносится на р/с: Гомельского райисполкома BY73AKBB36414140002703100000, филиала № 302 ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21302, УНП 400178549. Место, дата, время начала и окончания приема заявлений и прилагаемых к ним документов: г. Гомель, ул. Ильича, 51а, каб. 123, тел. 53 15 21. Дата и время начала и окончания приема заявлений: <u>**01.06.2019 по 01.07.2019 с 8.30 до 13.00 с 14.00 до 16.00**</u>.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель или юридическое лицо (лично либо через своего представителя или уполномоченное должностное лицо) в установленный в извещении о проведении аукциона срок подает заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона, представляет документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении, с отметкой банка, а также заключает с местным исполнительным комитетом или по его поручению с организацией соглашение установленной формы. Прием заявлений об участии в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленный комиссией или организацией день и час, но не ранее чем за 3 рабочих дня до даты проведения аукциона. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в комиссии или организации.

Сведения об участниках аукциона не подлежат разглашению.

Участникам предоставляется возможность осмотра земельного участка на местности с представителем комиссии по организации и проведению аукционов по продаже земельных участков в частную собственность и на право заключения договоров аренды земельных участков. Ознакомиться с земельным участком возможно при предварительном согласовании с управлением землеустройства Гомельского райисполкома, позвонив по телефону 53 15 21

У межах прыстойнасці

# КАМЕНТАРЫІ, АД ЯКІХ СЛЯЗЯЦЦА ВОЧЫ...

## Беларускія праграмісты збіраюцца спыніць паток абраз на форумах

**Многім вядомая слоўная сварка ў інтэрнэце паміж лідарамі ЗША і Паўночнай Карэі, падчас якой Трамп называў карэйскага лідара «карантышкам з ракетай» і «вар'ятам», а Кім Чэн Ын таго ў адказ — «гангстарам» і «разумова адсталым амерыканскім хрычом».**

**Не толькі вядомыя палітыкі не саромеючыся абражаюць адзін аднаго ў сацсетках. Звычайныя карыстальнікі, трапляючы ў анлайн-прастору, пакідаюць часта настолькі злосныя каментарыі, што калі паглыбіцца ў сеткавыя дыскусіі і форумы, можна стаць чалавеканенавіснікам. Ці можна з гэтым змагацца і як? Маладыя беларусы прапануюць сваё рашэнне праблемы.**

### РЭПЛІКІ КОШТАМ У ЧАЛАВЕЧАЕ ЖЫЦЦЁ

«Штогадовае даследаванне Microsoft, якое прысвечана тролінгу ў інтэрнэце, выявіла, што ў свеце каля 40 % людзей сутыкаюцца з абразамі ў сеціве. У постсавецкіх краінах гэты паказчык вышэйшы — 71 %. У нас гэта звычайная з'ява», — кажа **Аляксандр ГРАБЛЕЎСКІ.** Аляксандр скончыў з адзнакай эканамічны факультэт БДУ, цяпер заканчвае магістратуру. А ў вольны ад працы і вучобы час разам з іншымі праграмістамі займаецца праектам TrollBlock — распрацоўкай бота-антытроля. «Раней я любіў «павісець» на форумах, пачытаць меркаванні людзей, але апошнім часам у сувязі з вялікай колькасцю абразлівых каментарыяў і пераходу на асобы ад форумаў прынцыпова адмовіўся», — кажа малады чалавек.

І сапраўды. «Здохніце, уроды!», «На кол!», «Калі б у цябе была хоць кропля мазгоў...» — гэтыя і іншыя ўзаемныя абвінавачванні і праклёны так і сыплюцца на нашых форумах. Хутчэй за ўсё, большасці тролям не хапіла б смеласці сказаць чалавеку ў вочы і палову таго, што яны, карыстаючыся беспакаранасцю, пішуць у інтэрнэце. І калі ў новым законе аб СМІ прадугледжана ідэнтыфікацыя асоб, якія пакідаюць каментары на старонках сеткавых выданняў, што, як сцвярджаюць у Міністэрстве інфармацыі, дазволіць зрабіць дыскусію ў сетцы значна больш культурнай і паставіць бар'еры хамству, то на іншых інтэрнэт-рэсурсах ананімнасць па-ранейшаму развязвае рукі і языкі.

Многія дзяўчаты і жанчыны сутыкаюцца ў сетках з дамаганнямі і дыскрымінацыяй. А яшчэ ў інтэрнэце не любяць веганаў, чорнаскурых, прадстаўнікоў некаторых нацыянальнасцяў, людзей з нетрадыцыйнай сексуальнай арыентацыяй... Ды ці мала каго — ахвярай можа стаць любы.

Часам нападкі троляў могуць каштаваць нават жыцця. Па свеце ўжо коціцца хваля самагубстваў у выніку цкавання ў інтэрнэце. Так, летась скончыла жыццё самагубствам 31-гадовая італьянка, якая не перанесла ганьбы з-за інтымнага роліка з яе ўдзелам, што патрапіў у сеціва. Цкаванне няшчаснай дзяўчыны набыло такія маштабы, што ёй давялося пакінуць працу і пераехаць у іншы горад. Але нічога не дапамагло, і ў нейкі момант яна не вытрымала.

І падобныя выпадкі зусім не адзінкавыя. У Расіі, у Сочы яшчэ ў 2010 годзе наклаў на сябе рукі малады хлопец. Яго былая дзяўчына, жадаючы адпомсціць, распаўсюдзіла ў інтэрнэце чуткі пра яго гомасексуальнасць. Калісьці яна праводзіла гэтага хлопца ў войска, але, не дачакаўшыся, зацяжарала. Той адмовіўся прызнаваць дзіця, пасля чаго яго былая пасія распрацавала план помсты. Яна стварыла фэйкавы акаўнт у адной з сацсетак і прынялася рассылаць яго знаёмым паведамленні аб тым, што той — гей. У выніку пад вайсковымі фатаграфіямі маладога чалавека пачалі з'яўляцца зневажальныя каментарыі. Сябрам ён казаў, што не перажыве ганьбы. Так і здарылася.

### «МЫ ХОЧАМ АБАРАНІЦЬ ЛЮДЗЕЙ АД НЕКАНСТРУКТЫЎНАЙ КРЫТЫКІ»

Але нават калі справа і не набывае такога трагічнага кірунку, страты сеткавая агрэсія прыносіць нямалыя.

«Ёсць даследаванні, якія кажуць, што 27 % аўтараў адмовіліся ад публікацыі свайго меркавання, каментарыяў, пастоў, баючыся абраз на свой адрас, — кажа **Анатоль БЕЛЬЧЫКАЎ,** яшчэ адзін удзельнік каманды, якая працуе над антытролем. — Мы хочам абараніць людзей ад неканструктыўнай крытыкі, пазбавіць іх ад страху выказваць сваю думку».

Спачатку хлопцы плануюць запусціць свой прадукт для бізнесу, каб атрымаць рэсурсы для далейшага развіцця. Таму цяпер яны робяць памочніка для мадэратара. На сённяшні дзень большасць беларускіх форумаў маюць штат мадэратараў, якія чытаюць каментарыі карыстальнікаў, адсартоўваюць мат і найбольш «таксічныя» выказванні. Хлопцы збіраюцца стварыць нейронную сетку, якая дазволіць знаходзіць такія агрэсіўныя паведамленні ў аўтаматычным рэжыме і выдаляць іх самастойна.

«Нейронная сетка цалкам можа распазнаваць настрой выказвання і тэксту, дзякуючы як частотнаму аналізу слоў, што сустракаюцца ў тэкстах пэўнага эмацыянальнага кірунку, так і пабудове паўнавартаснай моўнай мадэлі таго, з якой імавернасцю сустрэнецца тое ці іншае слова пасля пэўнага мноства слоў да яго, — тлумачыць Анатоль Бельчыкаў. — Розныя машыны спраўляюцца з гэтым з рознай эфектыўнасцю, але гэта ўжо магчыма».

Для вырашэння задачы каманда праграмістаў вывучыла форумы аднаго з найбольш папулярных сеткавых беларускіх парталаў — і прачытала больш за мільён абразлівых і непрыстойных каментарыяў. Зараз у іх сабрана самая вялікая база «таксічных» выказванняў! У працэсе работы былі і спрэчкі. Якое выказванне лічыць таксічным? У кожнага было сваё меркаванне, бо часам абраза можа быць на першы погляд няяўнай, без выкарыстання нецэнзурнай лексікі і прыніжальных выразаў, але ад гэтага яна не перастае быць атрутнай. У рэшце рэшт дамовіліся лічыць «таксічным» каментарый абразлівага характару, калі пасля чытання яго чалавек хутчэй за ўсё пакіне гутарку і сыдзе з форума.

Пасля збору базы абразлівых выказванняў хлопцы пазнаёмілі з ёю спецыяльную матэматычную мадэль і навучылі яе пад патрэбы дадзенага форума. «Цяпер мы спрабуем інтэграваць гэтую мадэль у яго структуру, — кажуць яны. — Так што ў хуткім часе фільтрацыя паведамленні форуму будзе нейронная сетка».

А для звычайных карыстальнікаў каманда плануе ў далейшым зрабіць браўзернае пашырэнне, якое хавае абразлівыя каментарыі. «Мы ўпэўненыя, што зможам сфарміраваць больш-менш якасныя мадэлі, якія будуць працаваць без умяшальніцтва чалавека, — кажа **Аляксандр ГРАБЛЕЎСКІ.** — Як гэта працуе? Карыстальнік заходзіць на сваю старонку і бачыць нейкую колькасць паведамленняў, пры гэтым «таксічныя» паведамленні хаваюцца».

Дарэчы, каманда стартапа, у якой зараз восем чалавек, сабралася падчас 13-га сезона Social Weekend — хлопцы пазнаёміліся на хакатоне конкурсу сацыяльных праектаў. Там жа і загарэліся ідэяй стварэння TrollBlock — інструмента для фільтрацыі «таксічнага» кантэнту ў сетках. Іх праект дайшоў да паўфінала конкурсу.

**Святлана БУСЬКО.**

# ПРАВІЛЫ ПРАВЯДЗЕННЯ РЭКЛАМНАЙ ГУЛЬНІ «СВЕЖЫЯ НАВІНЫ АД «ЗВЯЗДЫ»!»

I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1. Рэкламная гульня пад назвай «Свежыя навіны ад «Звязды»!» (далей — Гульня) праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у адпаведнасці з гэтымі Правіламі ў тэрмін з 1 чэрвеня да 30 верасня 2019 года ўключна з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

2. Арганізатар Гульні — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (далей — Установа), месца знаходжання: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, УНП 100155376.

II. ПРЫЗАВЫ ФОНД ГУЛЬНІ

3. Прызавы фонд Гульні сфарміраваны за кошт маёмасці Установы і складаецца з наступных рэчаў:

| № п/п | Назва | Колькасць (шт.) | Цана за шт. з ПДВ, руб. | Усяго з ПДВ, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1. | Душавая кабіна «Акварэль» | 1 | 182,0 | 182,0 |
| 2. | Бак душавы з падаграваннем, 150 л. | 1 | 255,60 | 255,60 |
| 3. | Сотавы полікарбанат, 4 мм (апал) 6000*2100 (далей — суперпрыз) | 1 | 48,16 | 48,16 |
| 4. | Умывальнік «Акватэкс»(бак антыкараз. з ЭВН+мойка нерж.) (далей — прыз) | 7 | 140,0 | 840,0 |





Усяго прызавы фонд Гульні складае 1325,76 рубля (адну тысячу трыста дваццаць пяць рублёў семдзесят шэсць капеек).

III. УМОВЫ ЎДЗЕЛУ Ў ГУЛЬНІ

4. Гульня праводзіцца з мэтай стымулявання росту падпіскі на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

5. Удзельнікам Гульні можа быць любы грамадзянін Рэспублікі Беларусь, які пастаянна пражывае на яе тэрыторыі і які аформіў і аплаціў падпіску на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

6. Падставай для ўдзелу ў Гульні з'яўляецца дасланая падпісчыкам на адрас Установы ў перыяд з 1 чэрвеня да 16 ліпеня 2019 года выразаная з газеты або з дадатковага ўкладыша запоўненая картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды», якая змяшчаецца ў газеце не менш чым раз на тыдзень у перыяд з 1 па 30 чэрвеня 2019 года.

7. Адзін падпісчык можа даслаць толькі адну картку ўдзельніка. Падпісчык, які даслаў больш за адну картку ўдзельніка, выключаецца з Гульні.

8. Карткі ўдзельніка, наклееныя на паперу ці плёнку, адксеракапіраваныя або тыя, якія паступілі ва Установу пасля 16 ліпеня 2019 года па паштовым штэмпелі атрымання, да ўдзелу ў Гульні не прымаюцца.

IV. СКЛАД КАМІСІІ ПА ПРАВЯДЗЕННІ ГУЛЬНІ

9. Для правядзення Гульні Установа стварае камісію па правядзенні рэкламнай гульні (далей — Камісія) у наступным складзе:

Крачава Наталля Ільінічна — намеснік дырэктара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда» — старшыня Камісіі;

Члены Камісіі:

Чычко Аксана Мікалаеўна — начальнік упраўлення распаўсюджвання друкаваных СМІ РУП «Белпошта»;

Доўнар Валянціна Аркадзеўна — рэдактар аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда»;

Корбут Віктар Эдуардавіч — загадчык адміністрацыйна-гаспадарчага сектара рэдакцыйна-выдавецкай установы «Выдавецкі дом «Звязда».

10. Асобы, якія ўваходзяць у склад Камісіі, не могуць быць удзельнікамі Гульні.

V. ПАРАДАК РОЗЫГРЫШУ ПРЫЗОЎ

11. Розыгрыш прызоў ажыццяўляецца на пасяджэнні Камісіі 17 ліпеня 2019 года ў 12 гадзін у памяшканні Установы па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

12. Перад пачаткам розыгрышу карткі ўдзельнікаў сартуюцца па абласцях і горадзе Мінску, змяшчаюцца ў асобныя празрыстыя скрыні і старанна перамешваюцца.

13. Асобна для кожнай вобласці і для горада Мінска разыгрываюцца 7 прызоў (па адной для кожнага).

Затым усе карткі змяшчаюцца ў адну скрыню, перамешваюцца і сярод удзельнікаў разыгрываецца суперпрыз.

14. Пераможцам Гульні, які выйграў прыз, лічыцца ўдзельнік, чыё прозвішча напісана на дасланай ім картцы ўдзельніка, якую пры розыгрышы кожнага асобнага прыза выцягне выпадковым чынам са скрыні хто-небудзь з запрошаных удзельнікаў Гульні, прадстаўнікоў незалежных арганізацый або члены Камісіі. На кожнай такой картцы ўдзельніка надпісваецца выйграны прыз і распісваюцца члены Камісіі.

15. Вынікі розыгрышу прызоў афармляюцца пратаколам і публікуюцца да 25 ліпеня 2019 года ўключна ў газеце «Звязда».

Установа ў тэрмін да 25 ліпеня 2019 года дасылае пераможцам паведамленне аб выйграным прызе заказным пісьмом з указаннем тэрміну яго атрымання.

VI. МЕСЦА, ПАРАДАК І ТЭРМІН ВЫДАЧЫ ПРЫЗОЎ

16. Умовай выдачы прызоў і суперпрыза з'яўляецца прад'яўленне пераможцам пашпарта або дакумента, які пацвярджае асобу, і арыгінала абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

Пры звяртанні па атрыманне прыза або суперпрыза прадстаўніка пераможцы ён павінен прад'явіць даверанасць на атрыманне прыза або суперпрыза, пашпарт і арыгінал абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2019 года.

17. Адсутнасць у пераможцы, які выйграў прыз або суперпрыз, абанемента або квітанцыі аб падпісцы на газету «Звязда» на трэці квартал ці другое паўгоддзе 2019 года з'яўляецца падставай для адмовы ў выдачы яму прыза або суперпрыза ў сувязі з тым, што ён не адпавядае патрабаванням, якія прад'яўляюцца да ўдзельніка Гульні пунктам 5 гэтых Правілаў.

18. Прызы і суперпрыз выдаюцца пераможцам у тэрмін да 30 верасня 2019 года ў памяшканні Установы па адрасе: г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, з 9.00 да 13.00 і з 14.00 да 17.00, з панядзелка да суботы (выдачу ў суботу неабходна ўзгадніць з арганізатарам Гульні па тэлефонах (017) 263 66 73, 287 17 40 для атрымання пропускных дакументаў). Расходы, звязаныя з праездам пераможцаў па атрыманне прыза або суперпрыза, Установа не аплачвае.

19. Выплата грашовага эквіваленту кошту рэчавага прыза або замена яго на іншы прыз не дапускаецца.

20. Пасля 30 верасня 2019 года выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі ўдзельнікаў не прымаюцца.

VII. ЗАКЛЮЧНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

21. Пераможцы Гульні нясуць адказнасць за прадстаўленне падатковай справаздачнасці і за выплату ўсіх падаткаў, якія прадугледжаны дзейным заканадаўствам Рэспублікі Беларусь у сувязі з атрыманнем прызоў.

22. Пераможцы Гульні і іх сваякі згаджаюцца з тым, што іх імёны, прозвішчы, імёны па бацьку, фатаграфіі, лісты і інтэрв'ю могуць быць выкарыстаны Установай у любых рэкламных і/або інфармацыйных матэрыялах, якія звязаны з Гульнёй. Яны таксама згаджаюцца даваць інтэрв'ю і здымацца для рэкламных матэрыялаў у сувязі з Гульнёй без выплаты дадатковага ўзнагароджання. Усе правы на такія публікацыі належаць установе.

23. Правілы правядзення Гульні да яе пачатку будуць апублікаваны сумесна з рэквізітамі іх дзяржаўнай рэгістрацыі ў газеце «Звязда».

24. Даведкі, якія датычацца Гульні, можна атрымаць па тэлефонах (017) 263 66 73, 287 17 40.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 3563 ад 28.05.2019 г., выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.



## Марыя МАХАРЫНСКАЯ:

# «ШЛЯХ — ГЭТА І ЁСЦЬ ШЧАСЦЕ»

### Прызёрка кубкаў свету па скачках на батуце раскazвае пра Еўрапейскія гульні і дарогу да Алімпіяды

**МАРЫЮ Махарынскую многія называюць новым секс-сімвалам беларускага спорту, і гэта не дзіўна — яе старонкі ў сацсетках напоўнены выдатнымі фатаграфіямі, а колькасць падпісчыкаў вымяраецца тысячамі. Але сама дзяўчына называе сябе дастаткова закрытым чалавекам і кажа: «Ну што цікавага можа быць у дзяўчыне, якая сядзіць і вяжа?» Аднак наша гутарка пераконвае ў адваротным, гаварыць з Марыяй можна доўга і пра многае. У нашым інтэрв'ю размова пайшла ў першую чаргу пра спорт, пра тое, з якімі мэтамі Марыя адправіцца на Еўрапейскія гульні, як складваюцца яе ўзаемаадносіны з галоўным трэнерам Вольгай Уласавай і што цікавіць спартсменку за межамі прафесіі.**

## «Будзем старацца паказаць найлепшае»

***— Маша, частка сезона ўжо прайшла. Раскажыце, што атрымалася і да чаго будзеце імкнуцца далей.***

— З турніраў у першай палове года нам засталося выступіць толькі на Еўрапейскіх гульнях, гэта адзін з самых галоўных стартаў. А з ужо пройдзеных спаборніцтваў былі этапы Кубка свету ў Азербайджане і Мінску. Я засталася задаволеная тым, як выступіла ў Баку,

> **«Мая мара — выканаць сваю праграму ідэальна, і пажадана, каб гэта было ў фінале Алімпійскіх гульняў».**

падыходзіла да старту вельмі сур'ёзна, усё ж такі гэта першы ліцэнзійны (да Алімпійскіх гульняў 2020 года ў Токіа) этап Кубка свету. Выступала ў сваёй найлепшай форме, трапіла ў фінал. Пра мінскі этап не магу сказаць тое ж самае, падрыхтоўка была зусім іншай, у мяне былі нязначныя траўмы, але мы з імі справіліся і да Еўрапейскіх гульняў будзем падыходзіць ужо здаравейшымі. А ліцэнзійныя этапы Кубка свету працягнуцца восенню.

***— Наколькі важным стартам для вас будуць Еўрапейскія гульні?***

— На ўсіх нас ускладаецца вялікая адказнасць, не толькі на наш від спорту, а на ўсе, таму, зразумела, буду старацца паказаць найлепшае.

***— У адрозненне ад Алімпіяды на Еўрапейскіх гульнях будуць прадстаўлены як сінхронныя, так і індывідуальныя скачкі. На якую дысцыпліну будзеце рабіць стаўку?***

— Хацелася б, вядома, на абодва віды, бо гэтыя гульні як Алімпіяда. Было б здорава, каб і на Алімпійскіх гульнях можна было выступаць у сінхроне, але пакуль, на жаль, такой магчымасці няма.

***— Падчас этапу Кубка свету ў Мінску вы выступалі на «Мінск-Арэне» ўпершыню. Наколькі камфортна сябе там адчувалі?***

— У першыя дні трэніровак было складана прывыкнуць да такога вялікага памяшкання: столі, круглая арэна. Але пару дзён — і мы прызвычаіліся. Ва ўсякім разе, тое, што мы ўжо апрабавалі залу, дзе будзем выступаць падчас Еўрапейскіх гульняў, вялікі плюс для нас.

***— Якія задачы на гэты турнір перад вамі ставяць трэнеры?***

— Паказаць тое, што мы ўмеем. Мы разумеем, што чым вышэй, тым лепш, але канкрэтных месцаў нам ніхто не называе, так прасцей — не адхіляешся на знешнія фактары. Ты ведаеш сваю работу, зробіш яе — і вынік сам прыйдзе.

## «Памаліцца ўсім багам»

***— У скачкі вы прыйшлі, можна сказаць, выпадкова (за кампанію з братам), а калі адчулі, што гэта ваш шлях?***

— Дагэтуль не ведаю. У дзяцінстве скачкі былі проста як свавольства, прычым доўгі час. Але з нейкай прычыны я хадзіла на трэніроўкі — не памятаю, мабыць, скакаць мне вельмі падабалася.

***— Рана ці позна надыходзіць момант, калі ты альбо выбіраеш спорт, альбо не...***

— Момантаў выбару было шмат. Спачатку ў той час, калі я ўжо больш сур'ёзна пачала ставіцца да спорту, пачаліся складаныя праграмы, шмат трэніровак, а ўсе астатнія гуляюць на вуліцы, і табе, натуральна, таксама хочацца больш часу праводзіць з сябрамі. Было такое, што наогул спрабавала не хадзіць на трэніроўкі, хоць усім казала, што ў зале, а трэнеру, што хварэю. Але ўсё гэта выкрывалася, ды і сама я не магла без спорту і ўсё роўна вярталася. Самы вялікі прамежак, калі я не скакала, можа быць, месяц. І тое — гэта было вельмі даўно, цяпер тыдзень, і думаеш: ох, паскакаць бы.

***— Скачкі на батуце — тэхнічна складаны від спорту, цяжка было развучваць элементы?***

— У юнацкім узросце было значна прасцей, таму што не было страху, цяпер ужо здаровы сэнс прысутнічае і ты думаеш: а раптам я куды-небудзь улячу. Таму, каб выканаць новы элемент, спачатку трэба пахадзіць, памаліцца ўсім багам. Плюс, калі ты маленькі, ёсць такая цікавасць, каб зрабіць лепш за кагосьці.

***— Страх у вашым відзе спорту прысутнічае заўсёды?***

— У любым выпадку нейкае хваляванне ёсць, напэўна, увогуле гэта можна назваць страхам.



## «Заўсёды хацелася выскачыць са штаноў»

***— Памятаеце, калі ўпершыню вас паклікалі ў нацыянальную каманду?***

— У 2014 годзе сталі браць на зборы. Потым перада мной стаялі тры турніры — два этапы Кубка свету і чэмпіянат свету, на якіх я мусіла паказаць добрыя вынікі,





Марыя разам з Ганнай ГАНЧАРОВАЙ. Дзяўчаты выступаюць у сінхронных скачках.

каб трапіць у зборную. На чэмпіянаце свету мы з дзяўчатамі ў камандзе сталі трэцімі, і таму я трапіла ў зборную. Тады там было шмат вопытных спартсменаў — Таццяна Пятрэня, Святлана Макштарова, Мікалай Казак, але яны вельмі добра мяне прынялі. Хоць усё роўна было вельмі хвалююча, заўсёды хацелася выскачыць са штаноў, каб паказаць тое, што я магу. *(Усміхаецца.)*

***— Які вынік на гэты момант вы лічыце для сябе найлепшым?***

— Напэўна, этап Кубка свету ў Мінску (не сёлетні): індывідуальна добра выступіла і заняла другое месца. Значная для мяне падзея, таму што ў індывідуальных спаборніцтвах я вельмі рэдка штосьці паказваю, — выходжу ў фінал, але да п'едэстала мне заўсёды чагосьці не хапае.

***— Прычыну шукалі?***

— Вядома. Найчасцей не спраўляюся з хваляваннем, дзесьці недапрацоўваю, усё гэта збіраецца ў адну кучу і праз яе не атрымліваецца паказаць тое, што можаш. Працую над гэтым хваляваннем, мне здаецца, ужо на працягу ўсяго жыцця. *(Смяецца.)* Сінхронныя скачкі даюцца прасцей, не магу сказаць чаму, але гэта мой любімы від праграмы. Для мяне тут поўнае задавальненне. У індывідуальных скачках ты працуеш толькі для сябе, а там ёсць падтрымка і ты не можаш падвесці чалавека.

***— Ваш галоўны трэнер Вольга Уласава збоку здаецца «жалезнай лэдзі», ці проста працаваць з ёй на самай справе?***

— Вольга Анатольеўна ведае мяне, можна сказаць, усё жыццё, мы з дзяцінства працавалі ў адной зале, яна бачыла, як я расту. На спаборніцтвах яна вельмі засяроджаная, таму што калі ты глядзіш на трэнера і бачыш, што ён хвалюецца, сам пачынаеш трэсціся. А калі яна спакойная, спартсмен аўтаматычна становіцца таксама спакойным. Мы можам шчыра пагаварыць з Вольгай Анатольеўнай сам-насам, бо калі ў цябе нейкія праблемы ўнутры, то трэніроўкі таксама вельмі цяжка праходзяць, трэнеры гэта адчуваюць, таму ў нас цесныя стасункі.

***— Але спрэчкі паміж вамі бываюць?***

— Так, але Вольга Анатольеўна гатова нас выслухоўваць, мы прыходзім да кампрамісу, які дазваляе камфортна адно з адным працаваць.

***— Што для вас сёння самае складанае ў спорце?***

— Псіхалагічная нагрузка — складана спраўляцца з сабой, са сваімі дакучлівымі думкамі. З гэтым дапамагае псіхолаг, які з намі і на зборах, і на спаборніцтвах.

***— Нядаўна ў інтэрв'ю вы сказалі, што не марыце аб алімпійскім «золаце». Такое рэдка пачуеш ад спартсмена.***

— Атрымаць медаль найвышэйшай пробы, вядома, хочацца, але я не жадаю, каб гэта станавілася дакучлівай ідэяй: ты бачыш толькі яе і нічога навокал. А сам працэс? Шлях — гэта і ёсць шчасце. Алімпіяда ж не здарыцца ад пстрычкі пальцаў, на яе трэба адабрацца, зрабіць вельмі шмат працы.

## «Усю сям'ю абвязала шкарпэткамі»

***— У вас цікавыя хобі — маляванне і вязанне...***

— На зборах не малюю, таму што ўсё досыць абмежавана і думак для гэтага занятку няма, а вось пры вязанні ты супакойваешся, гэта дапамагае ў цяжкія дні. Памятаю, калі я была меншая, мала што атрымлівалася на батуце, і тады ўсю сваю сям'ю абвязала шкарпэткамі. Напэўна, у галаве было што пераварыць, а калі ты нешта робіш, заўсёды становіцца лягчэй.

***— Апошнім часам журналісты аддаюць вам усё больш увагі, як да гэтага ставіцеся?***

— Шмат хто кажа, што я вельмі адкрытая, а сама лічу сябе вельмі закрытай. Атрымліваецца, у кожнага сваё бачанне. Мне здаецца, я пра сябе наогул не расказваю толкам, люблю больш слухаць, мне нецікава пра сябе апавядаць, здаецца, у мяне такое сумнае жыццё. Хоць падабаюцца інтэрв'ю, ты размаўляеш з зусім іншымі людзьмі, бо па ўвесь час у зале з адными і тымі ж спартсменамі, гэта цяжкавата. Вядома, усе мне як сям'я, таму што 24/7 мы разам, але прыемна пагутарыць і з іншымі, гэта неяк развівае.

> **«Калі-небудзь усё прыйдзецца пачынаць з нуля, спорт не вечны».**

***— У вас шмат фотасесій, а там трэба адкрывацца перад фатографам. Збоку здаецца, што ў вас гэта атрымліваецца вельмі добра.***

— Проста вельмі шмат фотасесій ужо зроблена, а самыя першыя пачыналіся толькі з дурной усмешкай і няёмкасцю, я была як драўляная. Трэба ўвесь час трэніравацца, адразу разняволеней перад фатографам не зробішся.

***— Ці ёсць вобраз, у якім хацелася б зняцца?***

— Наогул, іх шмат. Мне заўсёды хацелася павесіць чорнае палатно, сесці на стул і іграць толькі тварам, але для гэтага трэба больш фатаграфавацца, каб навучыцца ў такім вобразе перадаваць эмоцыю.

***— Каб не спорт, у якой прафесіі вы маглі б рэалізавацца?***

— Мне здаецца, у любой, якая звязаная з творчасцю. Наогул, часта думаю пра гэта, але ўсё роўна прыходжу да таго, што, напэўна, скакаць пакуль у мяне атрымліваецца лепш. У любым выпадку, калі-небудзь усё прыйдзецца пачынаць з нуля, спорт не вечны. Штосьці спрабую, штосьці вывучаю.

***— Пра што вы марыце?***

— У адным з інтэрв'ю я сказала, што пра сям'ю і дзяцей, але гэта ж таксама не робіцца само сабой, да гэтага паступова прыходзіш. Ніколі не ведаеш, калі будзеш гатовы. Мне не хочацца, каб гэта быў выбар паміж спортам і сям'ёй або ахвярнасцю, хочацца да гэтага прыйсці паступова, каб усё склалася гарманічна. Яшчэ мая мара — выканаць сваю праграму ідэальна, і пажадана, каб гэта было ў фінале Алімпійскіх гульняў.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

*Мінск — Стайкі — Мінск.*

**Фота з архіва гераіні.**

## 13 и 25 июня 2019 года ОАО «Пинск-стройматериалы» проводит очередные 19 – 20 открытые торги в форме аукциона по реализации имущества

| | |
|---|---|
| Организатор торгов | Ликвидатор — **ОАО «Пинск-Стройматериалы»,** Ребковец Дмитрий Павлович, тел.: + 375 29 835 99 77; 44 776 19 47 |
| Время и место проведения торгов | **В 11.00** по юридическому адресу продавца |

| Номер лота | Наименование и краткое описание | Общая площадь, м² | Начальная цена лота, руб. без НДС | Размер шага аукциона, руб. | Сумма задатка, руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| **3** | Навес для материалов, ул. Пучкова, 14Д | **637,6** | **63 000** | **3 150** | **6 300** |
| **5** | Склад – модуль, ул. Пучкова, 14 | **881,2** | **153 000** | **7 650** | **15 300** |
| **6** | Магазин № 30 «Стройматериалы», ул. Пучкова, 14 | **602,5** | **243 000** | **12 150** | **24 300** |
| **7** | Магазин № 22 «Сделай сам», ул. Берковича | **206,5** | **61 900** | **3 095** | **6 190** |
| **8** | Магазин № 4 д. Пинковичи, ул. Лунинецкая, 39 | **198** | **62 500** | **3 125** | **6 250** |
| **9** | Магазин № 15, ул. Горького, 57 | **526,4** | **361 000** | **18 050** | **36 100** |
| **12** | Пилорама ленточная MG-6200 | | **2 500** | **125** | **250** |
| **13** | Станок 4-сторонний TOSSVITA | | **7 700** | **385** | **770** |

Подробно с имуществом и условиями можно ознакомиться с пон. по пят. с 8 до 18 по адресу продавца, на сайте **brest-region.gov.by** и у организатора торгов

| | |
|---|---|
| Шаг аукциона | 5 % от начальной цены лота |
| Размер задатка | 10 % от начальной цены лота. Задаток до подачи заявления перечисляется на **р/с BY 39 PJCB3012 5200 0410 0000 0933 в Приорбанк ОАО БИК PJCBBY2X, УНН 200250973** |
| Документы, необходимые для участия в торгах | Заявление на участие в аукционе, платежный документ с отметкой банка о внесении задатка, копии документов, подтверждающие юридические полномочия участника торгов, предоставляются не позднее **10.00 в день проведения аукциона** |
| Возмещение затрат | Победитель (претендент) возмещает затраты, связанные с подготовкой по организации и проведению аукциона из расчета 1,85 % от начальной цены лота, которые подлежат уплате в течение 3 (трех) рабочих дней с даты проведения аукциона |

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона (оператор ЭТП)** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Продавец** | Частное предприятие «Эдэн-Н», г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 143Б/2, пом. 14, каб. 600/7 |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

Предмет электронных торгов
Месторасположение **– г. Минск, ул. Кропоткина, д. 91, пом. 2**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Производственный корпус № 3** | 3230,8 кв. м | 500/D-707995487 |

***Сведения о земельных участках,*** предоставленных продавцу на праве аренды (срок действия по 30.04.2022) для размещения объектов неустановленного назначения:
1) пл. **0,2643 га** и **0.0090 га** (производственное помещение);
2) пл. **0,0198 га** (доля: 1/2), **0,0574 га** (проезд)

**Начальная стоимость без НДС — 1 235 790 долларов США**
(снижена на 10 %)

*Примечание: цена продажи предмета аукциона указывается в договоре купли-продажи с учетом НДС

**Задаток 10 %** по курсу НБРБ на дату платежа от начальной цены предмета аукциона перечисляется на счет BY92 BELB 3012 0048 3500 8022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка», УНП 191224638

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи.

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение **3 (трех)** рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 18.06.2019** в 14.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 20.04.2019

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация) на ЭТП ipmtorgi.by: 14.06.2019** до **17.00**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## Извещение о проведении электронных торгов

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, офис 5 |
| **Продавец** | ОАО «МОТОВЕЛО», г. Минск, пр-т Партизанский, 8 (тел. + 375 44 743 00 30) |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| **Адрес ЭТП** | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

**Предприятие как имущественный комплекс ОАО «МОТОВЕЛО»**
(регистрационный номер 0001427, свидетельство № 3420 от 4 января 2019 г.). Состав имущества и имущественных прав см. на сайте www.cpo.by

Месторасположение производственной базы **–**
**Минская обл., Минский р-н, Юзуфовский с/с, 39, район д. Лесины**

**Начальная стоимость без НДС – 144 672,19 бел. руб.** (снижена на 10 %)
Шаг аукциона без НДС – 7 233,61 бел. руб.

| | |
|---|---|
| **Порядок ознакомления** | Ознакомление заинтересованных лиц с предметом электронных торгов осуществляется в рабочие дни. Ответственное лицо: Чарный Дмитрий Николаевич, тел. + 375 44 743 00 30 |

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа — ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| Срок подписания договора купли-продажи | **15** (пятнадцать) рабочих дней после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее тридцати дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение, в размере 2 % от итоговой цены продажи предмета электронных торгов, в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 27.03.2019

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата, время и место проведения электронных торгов: 20.06.2019 в 14.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» (**www.ipmtorgi.by**)

**Дата и время окончания приема документов (предварительная регистрация), в т. ч. перечисления задатка: 18.06.2019** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. Email: auction@cpo.by** |

## Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

**сообщает о проведении 04.07.2019 открытого аукциона**

**Лот № 1.** Комбайн зерноуборочный (категория «D») Лида 1300, г. в. – 2001, заводской номер 257, двигатель Cummins 46080565, цвет – красный, инв. № 11200140
***Начальная цена продажи: 18 740,87 бел. руб.***
***Сумма задатка: 1 874,09 бел. руб***

**Аукцион состоится 4 июля 2019 года в 12.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352. Подача заявок (осуществляется лично) и внесение задатка: по 02.07.2019 до 12.00 в рабочие дни с 8.30 до 12.30, с 13.30 до 16.30. Аукцион может быть отменен в любое время, но не позднее чем за три дня до даты аукциона

Расчетный счет для перечисления задатка: получатель платежа — РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с BY21BPSB30121543370109330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, BIC банка BPSBBY2X

Продавец: РУСПП «Могилевское Госплемпредприятие», УНП 700018980, Могилевская обл., Могилевский р-н, д. Черемушки, ул. Центральная, 1

Порядок проведения аукциона: для участия в аукционе приглашаются резиденты и нерезиденты Республики Беларусь, которые внесли в установленном порядке задаток для участия в аукционе, своевременно подали заявление на участие в аукционе со всеми необходимыми документами, заключили с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон. Лот продается без условий на открытом аукционе с применением метода повышения начальной цены, с шагом пять процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем аукциона признается участник, предложивший наивысшую цену. Единственный участник имеет право приобрести объект продажи по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Срок и условия оплаты:** победитель аукциона возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в течение трех рабочих дней со дня проведения аукциона. Победитель аукциона обязан в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня подписания протокола аукциона подписать договор купли-продажи предмета аукциона. Оплата предмета аукциона производится на условиях заключенного договора купли-продажи. Внесенный Победителем аукциона задаток засчитывается в счет оплаты предмета аукциона

**Организатор аукциона**:
**Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
УНП 190055182, г. Могилев, ул. Первомайская, 77, к. 352, Mogilev@ino.by.
Дополнительную информацию можно получить
**по тел.: +375222 72-41-14, +37529 624-26-25, на сайте ino.by**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ГП «ЩУЧИНСКАЯ МПМК-166»

| Предмет торгов | Начальная цена без НДС, руб. | Размер задатка, руб. |
|---|---|---|
| Лот № 1 — экскаватор «Борекс 2102», 2007 г. в., рег. знак СА-4 8649 | 7 557,47 | 755,75 |
| Лот № 2 — грузовой специальный автокран КАМАЗ 43253, 2006 г. в., рег. знак CI 7262 | 23 544,78 | 2 354,48 |
| Лот № 3 — грузовой специальный автокран MAZ 6303 А3, 2010 г. в., рег. знак АВ 8343-4 | 45 226,07 | 4 522,61 |
| Лот № 4 — грузовой специальный автокран КАМАЗ 53215, 2007 г. в., рег. знак АА 4472-4 | 28 721,03 | 2 872,10 |
| Лот № 5 — грузовой автокран КАМАЗ 55111, 2007 г. в., рег. знак АА 4493-4 | 29 719,30 | 2 971,93 |
| Лот № 6 — погрузочное шасси «Амкодор 342С-03», 2007 г. в., рег. знак СА-4 9568 | 9 580,17 | 958,02 |
| Лот № 7 — погрузчик фронтальный одноковшовый кат. F ВМЕ-1565, 2010 г. в., рег. знак СВ-4 2632 | 9 671,78 | 967,18 |
| Лот № 8 — полуприцеп платформа тентовая МАЗ 975800-013, 2008 г. в., рег. знак А 2119 А-4 | 4 157,87 | 415,79 |
| Лот № 9 — грузовой седельный тягач МАЗ 6430 А8-360-020, 2008 г. в., рег. знак АА 6526-4 | 10 827,86 | 1 082,79 |
| Лот № 10 — грузовой специальный подъемник гидравлический МАЗ 5337 А2-340, 2008 г. в., рег. знак АА 6525-4 | 10 482,32 | 1 048,23 |
| Лот № 11 — полуприцеп специальный платформа 993920, 2008 г. в., рег. знак А 3044 А-4 | 6 877,88 | 687,79 |
| Лот № 12 — экскаватор ЕК 18-20, 2008 г. в., рег. знак СА-4 9584 | 27 145,67 | 2 714,57 |
